незалежная газета

№ 24 (669) 30 чэрвеня 2010 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады

## Дзесяць рэзідэнцый Лукашэнкі

Старонка 8



## Сталінград XVII стагоддзя

Старонка 10



## Лявон Вольскі: Я бачу прагрэс

Старонка 11



## У НУМАРЫ

**Васілевіч здаў Байкову**

Жанчына ўжо чатыры месяцы знаходзіцца ў следчым ізалятары КДБ. **Старонка 2.**

**«Мінск-сіці» забудуюць таннымі панэлькамі**

Інвестары атрымлівалі льготы пад інавацыйнае будаўніцтва, а ўзвядуць звычайныя панэльныя дамы. **Старонка 4.**

**85% супрацоўнікаў мінскага АМАПа забяспечаныя жыллём**

У вайсковым гарадку «Уручча» ўведзеныя ў эксплуатацыю яшчэ два 111-кватэрныя службовыя дамы. **Старонка 5.**

**Пятро Краўчанка: Улёткі Бразаўскаса друкавалі ў Мінску**

26 чэрвеня на 78-ым годзе жыцця памёр былы прэзідэнт Літвы Альгірдас Бразаўскас. **Старонка 8.**

**Цана чалавечай памылкі**

Жарсці чэмпіянату свету па футболе. **Старонка 6.**

**Вы думаеце, выхаванне штосьці значыць?**

Для здароўя ці жыццёвага шляху вашых дзяцей — нічога. Але любоў бацькоўская не забываецца. Новыя даследаванні генетыкі паводзінаў. **Старонка 13.**

ТУРЫСТЫЧНАЕ АГЕНЦТВА
«ГІСТОРЫЯ-ТУР»
600 -годдзю «Грунвальдскай Бітвы» прысвячаецца
Тур «Шлях на Грунвальд»
Лідзбарк Вармінскі – Ольштын – Мальбарк – Грунвальд 13-18.07.2010
Цана: ад 120 еўра (усё ўключана)
(029) 677 00 46 www.h-t.by




## Сяргей Мусіенка: «Ні адна краіна ў свеце так не залежыць, як мы»

Газавая вайна на гэты раз сябе вычарпала. Беларусы заплацілі запазычанасць «Газпрому», а расійскі бок расплаціўся за транзіт. Лукашэнка прызнаўся, што грошы пазычыў у прэзідэнта Азербайджана Ільхама Аліева. Гутарка пра вынікі і наступствы газавай вайны з дырэктарам лукашэнкаўскага Аналітычнага цэнтра EcooM Сяргеем Мусіенкам.

**«Наша Ніва»: Ці можна гаварыць, што з газавай вайны нехта выйшаў пераможцам?**

**Сяргей Мусіенка:** У войнах рэдка бываюць пераможцы. Яны пачынаюцца дзеля задавальнення ўласных амбіцый. У дадзеным выпадку здарылася тое, што нас абразілі. Маніпуляцыю з закручваннем газавай трубы ў гадавіну пачатку Вялікай Айчыннай вайны нашы людзі ўспрынялі адназначна. Адгаворкі, што мы не помнілі гэтага дня, не праходзяць, бо людзям, якія не помняць сваёй гісторыі, наканаванае знікненне. Гэта не я прыдумаў. У папярэдніх ганзлёвых войнах з Расіяй мы шукалі, у чым жа вінаватыя. Але пасля гэтай балючай аплявухі ад братняга народа многае стала ясным.

Працяг на старонцы 3.

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

## Пяройдзем на звадкаваны газ з Клайпеды?

Літоўцы гатовыя дапамагчы Беларусі з газам, асабліва калі тая адмовіцца ад пабудовы АЭС.

Падчас беларуска-расійскага газавага канфлікту асаблівую актуальнасць набылі пошукі альтэрнатыўных крыніц газу. Пра адзін з патэнцыйных варыянтаў, сланцавы газ, «Наша Ніва» расказвала ў папярэднім нумары. Цяпер прыйшоў час высвятлення плюсы і мінусы яшчэ адной перспектывы — звадкаванага газу.

Звадкаваны прыродны газ займае каля 1/600 аб'ёму прыроднага газу ў газападобным стане. Ён не мае паху, колеру і нетаксічны. У працэсе звадкавання выдаляюцца некаторыя кампаненты, такія як пыл, кіслыя газы і вада. Пасля яго ахалоджваюць да мінус 162 градусаў па Цэльсію. Змяншэнне аб'ёму робіць газ больш эканамічна эфектыўным для транспартавання на вялікія адлегласці. Паміж кантынентамі яго перавозяць на крыягенных суднах. Каб пераняць газ назад на сушу, патрэбныя спецыяльныя тэрміналы.

Працяг на старонцы 4.

## Васілевіч здаў Байкову

Жанчына ўжо чатыры месяцы знаходзіцца ў следчым ізалятары КДБ.

Генеральны пракурор Беларусі Рыгор Васілевіч пракаментаваў сітуацыю са следчай Генпракуратуры па асабліва важных справах Святланай Байковай.

«Гэта крайне непрыемнае пытанне», — сказаў Васілевіч. Тэрмін знаходжання Байковай пад вартай падоўжаны яшчэ на два месяцы, да 24 жніўня. Прычым, згоду даў сам Васілевіч, які да гэтага ўпарта абараняў сваю падначаленую перад чэкістамі.

Генпракурор выказаўся адносна справы мытнікаў, якую расследавала Байкова. «Па справе праходзілі дзясяткі чалавек. Былі і перагінанні. Не заўсёды арышты былі абгрунтаванымі і законнымі. На жаль, культурны слой у любой арганізацыі трэба стварыць даўно. Расследаванні справаў 2006—2007 гадоў праходзілі не зусім ідэальна. Не ўсё так адназначна ў дзеяннях следчага. Давайце не будзем ідэалізаваць следчага», — кажа пракурор.

Ці не сведчыць дадзеная справа, што ўплыў Генеральнай пракуратуры ў верхніх эшалонах улады змяншаецца? «У кожнага ведамства ёсць свае паўнамоцтвы. І дзейнасць адбываецца ў рамках гэтых паўнамоцтваў. Увогуле, у параўнанні з іншымі краінамі, пракуратура РБ мае досыць шырокія паўнамоцтвы. Большыя, скажам, чым у Расіі», — адзначыў Рыгор Васілевіч.

На ягоную думку, не існуе ніякага супрацьстаяння паміж сілавымі ведамствамі. «Калі спрэчкі ўзнікаюць, то яны вырашаюцца ў рамках закона».

**Зміцер Панкавец**

**Чытаеш прашэнне былой следчай на адрас Лукашэнкі і міжволі насоўваецца параўнанне са сталінскімі часамі, калі «ворагі народа» з былых камуністаў перад смерцю крычалі: «Жыве таварыш Сталін!». Піша Андрэй Пачобут.**
**Старонка 7.**



**Новая традыцыя: выпускнікі Вайсковай акадэміі і іншых ВНУ Мінабароны і МНС арандуюць на выпуск шыкоўныя аўтамабілі. Маладыя афіцэры аб'язджаюць у іх Мінск у абдымку са сваімі дзяўчатамі, шумна вітаючы людзей на вуліцах.**

# Ветэраны Фронту будуць ваяваць за Саннікава

Да Івашкевіча далучыліся Хадыка, Голубеў, Марачкін.

23 чэрвеня частка сяброў Партыі БНФ абвесціла сваё рашэнне далучыцца да каманды кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саннікава. Вёў сустрэчу Віктар Івашкевіч.

Палітык сказаў, што ягоны ўчынак разглядаўся на пасяджэнні Сойму БНФ і гарадской рады. Агучвалася пытанне магчымага прыпынення ягонага сяброўства ў партыі, а то і выхаду. Тым не менш, паплечнікі Віктара Івашкевіча аднагалосна выказаліся за тое, каб ён заставаўся ў БНФ.

Сп. Івашкевіч падкрэсліў, што ўнутры партыі ёсць рознагалоссі, але факт, што прэс-канферэнцыя адбываецца на Сядзібе з дазволу кіраўніцтва, сведчыць пра існаванне кансэнсусу. «Ёсць разуменне таго, што мы робім супольную справу».

Разам з Івашкевічам прыйшлі Юры Хадыка, Валянцін Голубеў, Аляксей Марачкін, Алесь Шатэрнік, а таксама кіраўнікі шэрагу раённых арганізацый партыі сталіцы і рэгіёнаў. Усе яны заявілі пра свой намер працаваць у камандзе Саннікава.

Большасць патлумачыла свой намер незадаволенасцю дзеяннямі сённяшняга кіраўніцтва партыі, недаверам да ўнутрыпартыйнага кандыдата, а менавіта магчымасцю зняцця яго на карысць аднаго з кандыдатаў у прэзідэнты. Юры Хадыка заявіў, што Рыгора Кастусёва, найхутчэй, «вылучылі пад Мілінкевіча».

Хадыка патлумачыў, што пераход часткі сяброў партыі ў каманду Саннікава — гэта спроба націснуць на кіраўніцтва партыі, каб аб'яднацца вакол аднаго кандыдата, таго, хто найбольш адпавядае інтарэсам партыі, а найперш — Беларусі. Да каманды Саннікава таксама далучыўся кіраўнік Мінскай абласной рады Зміцер Вінаградаў.

**Сямён Печанко**

### Сцісла

• **Лукашэнка: «Мы не павінны паўтарыць памылку, якая была з Расеяй».** Урад павінен шукаць новыя крыніцы і маршруты паставак энерганосьбітаў, хаця Беларусь не зможа ў поўным аб'ёме адмовіцца ад расейскіх энергарэсурсаў. Гэта заявіў Лукашэнка на ўрадавай нарадзе. Паводле Лукашэнкі, Беларусь павінна закупіць 4 млн т нафты сёлета і 10 млн т у 2011-м па-за Расеяй.

• **Самыя стратныя — малаказаводы.** Паводле Мінфіна, колькасць стратных адкрытых акцыянерных таварыстваў у Беларусі павялічылася проці 2008 года амаль на 25%. 2009 год скончылі са стратамі 239 ААТ. Найбольшая колькасць стратных ААТ прыпадае на малакаперапрацоўку. У антырэйтынгі ўвайшлі 13 малочных заводаў.

• **Па Вільні будзе ездзіць беларускі тралейбус «Вітаўт».** Сталіца Літвы ўзяла яго на выпрабаванне. Яго салон абсталяваны не толькі месцамі для інвалідаў і бацькоў з малымі дзецьмі, але і асобнымі пляцоўкамі для раварыстаў. Каштуе «Вітаўт» 650 млн рублёў за штуку.

• **У Кобрынскім раёне патануў дзевяцігадовы хлопчык-інвалід.** Трагедыя здарылася ля вёскі Повіць. Дзіця хварэла на дзіцячы цэрабральны паралюш і перамяшчалася на інвалідным вазку. Хлопчык сядзеў у вазку на беразе, калі яго прыяцель пайшоў купацца. Якім чынам ён выпаў з вазка ў ваду і патануў, высвятляе пракуратура.

• **Хто быў той ксёндз?** У касцёле мястэчка Варняны на Астравеччыне пад слоем тынкоўкі знойдзеная фрэска XVIII ст. Выява маладога паўнаватага чалавека, выкананая ў надзвы рэалістычнай манеры. Праўдападобна, зробленая з натуры ў другой палове XVIII ст.

• **Блатэр выбачыўся перад зборнымі Англіі і Мексікі.** Прэзідэнт ФІФА Ёзэф Блатэр прынёс ім афіцыйныя прабачэнні. У матчах 1/8 фіналу чэмпіянату свету яны пацярпелі ад сур'ёзных памылак суддзяў. Блатэр заявіў, што будзе распрацавана праграма, накіраваная на павышэнне ўзроўню судзейства.

• **Ясна, цёпла цэлы тыдзень.** Дажджоў амаль не будзе, а тэмпературы дасягнулі сапраўды ліпеньскага ўзроўню.

**Сяргей Мікулевіч; СХ; «Заўтра тваёй краіны»**

### Самае чытанае на nn.by за 23—29 чэрвеня

- На ўнікальны храм у Навагрудку хочуць прысабачыць «цыбуліны»
- «Народная воля» прапануе кандыдатам у прэзідэнты ад апазіцыі прэм'ера Сідорскага
- «Мы чулі, што нас за спінай называюць талібамі»
- Фэст у Навагрудку
- «Гайдамакі», Вольскі і Будзьма together!
- Сталінград XVII стагоддзя
- Украінскія феміністкі зладзілі акцыю «Сучкі» каля будынка СБУ
- На Нямізе зноў патоп — фотарэпартаж
- Актывісты «Гавары праўду» не паразумеліся з БРСМ
- Ветэраны Фронту будуць ваяваць за Саннікава

### nn@nn.by

**«Гаспадар маёнтка Матусевічы» (№23)**

Цуд. Матусевіч — кветка, якая прабілася праз асфальт.

**Віталь з Менску**

Так і хочацца паехаць у гэтыя Мацкі, пабыць з гэтым чалавекам, папрацаваць разам з ім.

**Валеры Мазынскі**

Вось за такімі гаспадарамі будучыня, а не за саўгасамі імя лямпачкі Ілліча...

**Анатоль П.**

Такія людзі павінны засядаць у палаце, кіраваць абласцямі і г.д.

**Klv**

**«Я знайшла сваю мову дзякуючы хлопцу» (№23)**

Я таксама не збіраюся вяртацца да расейскай (апошнім разам карыстаўся ва ўніверсітэце), а цяпер нават мае калегі з іншых фірм адказваюць мне на беларускай.

**Ягор**

Як гавораць у Дакудаве, бязмежны рэспект Вам! :)

**Лёкса**

Аддаю дачку ў першы клас беларускамоўнай гімназіі №23 і спадзяюся, што з яе таксама будзе сапраўдная беларуска, якая не будзе саромецца роднай мовы.

**Хэльвіг**

# Не ўсё ў жыцці апошні раз

## Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам даставіць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Адрш. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

## Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

## Дзякуй падпісчыкам,

якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Антону Т. са Смалявіцкага раёна.
Віталю Ц. са Жлобінскага раёна.
Валянціне М. з Навагрудскага раёна.
Юрыю Б. з Бабруйскага раёна.
Паўлу Я. з Горацкага раёна.
Вользе Ш. з Ваўкавыска.
Віктару Д. з Капыльскага раёна.
Веры Ч., Алене І., А.П. з Брэста.
Міхаілу Т. са Слуцкага раёна.
Уладзіміру Н., Віктару А., Аркадзю М., Сяргею П., Анатолю Л. з Гомеля.

# «Мы можам аб’яднаць фінансавыя рэсурсы»

**Прэм’ер Літвы Андрус Кубілюс першым з заходніх палітыкаў наведаў Беларусь пасля газавай вайны. Ён сустрэўся з Лукашэнкам, Сідорскім і лідэрамі незалежнага грамадства. Кубілюс даў зразумець: насуперак пажаданням часткі апазіцыі, палітычныя пытанні не будуць увязвацца з эканамічнымі.**



БЕЛАПАН

Літоўскі прэм'ер прыехаў у Беларусь на запрашэнне беларускага калегі Сяргея Сідорскага. Разам з ім кіраўнік урада Літвы адкрыў гандлёвы цэнтр ОМА, удзел у пабудове якога браў фінскі холдынг KESKO і літоўскі Senukai, які валодае магутнай сеткай маркетаў у Літве.

Аднак цэнтральным пунктам візіту стала размова літоўскага прэм'ера з кіраўніком Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам. Яна зацягнулася амаль на паўтары гадзіны даўжэй запланаванага. Прадстаўнікі літоўскага бізнесу ў Беларусі, сабраныя ў амбасадзе, мусілі чакаць. Чакалі і лідэры незалежнага грамадства, якіх Кубілюс меў спаткаць пасля інвестараў.

Галоўнай тэмай перамоваў сталі вынікі і наступствы газавай вайны.

Беларускі бок сам акцэнтаваў увагу на пытаннях энэрганезалежнасці. Як наўпрост сфармуляваў Лукашэнка, Беларусь прапануе Літве «рэалізацыю сумесных праектаў па ўмацаванні незалежнасці дзяржаў».

«Каб умацаваць суверэнітэт і незалежнасць, моц нашых дзяржаў, неабходна неадкладна зрабіць шэраг захадаў па ўмацаванні гэтай незалежнасці», — сказаў Лукашэнка, перанасыціўшы свой лексікон незалежніцкай рыторыкай.

У той жа час Лукашэнка досыць эмацыйна зрэагаваў на ўзняцце Кубілюсам пытанняў правоў чалавека і свабоды СМІ ў Беларусі. Пра гэта расказаў лідэрам незалежнага грамадства сам прэм'ер.

## Што канкрэтна цікавіць Беларусь?

У Клайпедзе літоўцы будуюць тэрмінал для прыёму звадкаванага газу. На сёння ён з'яўляецца выдатнай альтэрнатывай расійскім энерганосьбітам. Еўрапейскія краіны набываюць звадкаваны газ у Катары па цане $174—176 у пераліку на тысячу кубоў. Дастаўка абыходзіцца яшчэ ў сотню. Беларусь у наступным годзе мае плаціць Расіі $210 за тысячу кубоў газу звычайнага.

На мінулым тыдні пытанне беларускага ўдзелу ў пабудове тэрмінала стаяла на парадку дня перамоваў міністраў энергетыкі Беларусі і Літвы.

Прэм’ер-міністр Літвы лічыць, што ў дзвюх краін ёсць добрыя магчымасці супрацоўніцтва ў энергетыцы з мэтай умацавання незалежнасці дзяржаў. «Залежнасць ад аднаго пастаўшчыка якіх-небудзь рэсурсаў часам стварае праблемы. У гэтым плане ў нас ёсць добрыя магчымасці. Мы можам ісці такім шляхам умацавання незалежнасці, рэалізоўваць агульныя стратэгічныя праекты, у якіх быў бы зацікаўлены і Еўрапейскі Саюз», — сказаў ён. На яго думку, добрыя магчымасці ў гэтым плане дае «Усходняе партнёрства».

У той жа час Літва мае інтарэс і да дробных інвестыцыйных ідэй у Беларусі, кшталту таго самага ОМА. Ёсць цікавасць і да прыцягнення еўрасаюзаўскіх грошай на сімвалічныя праекты. Напрыклад, Сідорскі паведаміў, што Беларусь і Літва маюць намер арганізаваць хуткасны рух пасажырскіх цягнікоў паміж Мінскам і Вільняй. «Мы дамовіліся сумесна звярнуцца да ЕС у гэтым пытанні», — сказаў прэм’ер.

Візіт Кубілюса пацвердзіў: эканамічныя адносіны Беларусі і ЕС будуць развівацца. Насуперак пажаданням часткі апазіцыі, палітычныя пытанні не будуць увязвацца з эканамічнымі.

Літва гатовая быць лакаматывам эканамічнай супрацы. У той жа час аб правах чалавека Мінску нагадваць будуць. Бо хто як не Вільня разумее: асновай незалежнасці і бяспекі ёсць дэмакратыя і грамадзянская супольнасць. Сімвалічная сустрэча з лідэрамі незалежнага грамадства тое пацвердзіла.

У рамках візіту прэм’ер Літвы наведаў таксама Чэрвеньскі раён — месца, дзе 26 чэрвеня 1941 годзе саветы расстралялі тысячы вязняў.

**Мікола Бугай**

# Сяргей Мусіенка: Ніводная краіна ў свеце так не залежыць, як мы

Працяг са старонкі 1.

З нас запатрабавалі міфічны доўг за газ. Дзірка ў паўмільярда даляраў істотная для бюджэту любой краіны. Разам з тым, «Газпром» абсалютна стратная арганізацыя. Яна датуецца за кошт крэдытаў расійскай дзяржавы. І за нашы грошы яны хацелі разлічыцца з гэтымі даўгамі. Гэтыя грошы для «Газпрома» істотныя. Успомніце, што нешта падобнае было ў Азербайджане, калі «Газпром» спачатку перакрываў трубу, а потым прасіў газ, бо свайго не хапае. Паўночны газаправод нікому не патрэбны, бо нават тыя трубы, што праходзяць праз тэрыторыю Беларусі, запаўняюцца напалову.

**«НН»: Вы звязваеце гэта з ціскам на Беларусь адносна падпісання Мытнага саюза?**

**СМ:** Часткова. Вядома, ціск ёсць. Але зірніце ў любую энцыклапедыю, хай гэта будзе «Брытаніка» ці нешта іншае, вызначэнне «Мытнага саюза». Беларусы яго разумеюць, а вось нашы расійскія таварышы — не. Нельга, каб межаў паміж краінамі не было, а газ і нафта былі зусім па розных цэнах. У такіх умовах наша эканоміка хутка выбухне.

**«НН»: А плаціць за газ па поўных цэнах для Беларусі рэальна?**

**СМ:** Мы не супраць плаціць, але няхай і расіяне плацяць. Не многія памятаюць пра дамову з Расіяй аб роўнадаходнай аплаце за энергарэсурсы. Немагчыма быць у адной дзяржаве, але плаціць па-рознаму. Можна параўнаць з арганізмам чалавека, у якім адзін з членаў перавязаны жгутом па артэрыі. Такі арганізм доўга не вытрымае і адваліцца. Расіяне кажуць, што не могуць сабе дазволіць павялічыць цэны, бо не вытрымае іх інфраструктура. Нашы цэны ніжэйшыя за еўрапейскія, але яны не могуць нават нашых вытрымаць. Расіяне кажуць, што выйдуць на адзіны ўзровень з еўрапейскімі краінамі да 2015 года, але давайце і мы таксама. Гэта будзе чэсна.

**«НН»: У замежнай палітыцы Беларусі пасля гэтага канфлікту могуць адбыцца змены?**

**СМ:** Як нам мяняць? У Беларусі шматвектарная палітыка, якая разлічаная на многія краіны. Рэзкіх змен тут быць не можа. Калі Расія так сябе паводзіць, то мы тут ні пры чым.

**«НН»: То бок павароту ў бок Еўропы не будзе?**

**СМ:** Ён ёсць, яўна прасочваецца. Паступовы рух захаваецца. Гэта таксама будзе залежыць ад еўрапейскіх партнёраў. У Клайпедзе будуецца тэрмінал для звадкаванага газу. Цяпер Польшча спадзяецца на сланцавы газ, нешта падобнае ёсць і ў нас. Пацiху гэты рух будзе, каб не настолькі жорстка залежаць ад расійскіх паставак паліва. Ніводная краіна ў свеце так не залежыць, як мы. Дарэчы, мала хто ведае, што сабой уяўляюць такія краіны, як Бахрэйн і Катар. Яны цалкам залежаць ад паставак нафты з Саудаўскай Аравіі. У іх там свае нафтаперапрацоўчыя заводы, дык аравійцы маглі б імгненна спыніць іх працу. Але арабы знаходзяць цывілізаваныя адносіны. Ёсць такі тэрмін «дуальныя эканомікі», які датычыць каланіяльных краін, суседніх краін. Такія дуальныя прыклады — Англія і Ірландыя, Іспанія і Партугалія. Важна, каб наша дуальная структура не перарасла ў дуэль.

**«НН»: Дык, можа, ідэя саюзнай дзяржавы сябе вычарпала?**

**СМ:** Вычарпаў сябе яе лідэр. Пал Палыч Барадзін павінен пайсці на пенсію. Падчас усіх канфліктаў, малочных, нафтавых, цукровых, ён хаваўся ад адказнасці. Кіраўнік павінен вырашаць такія пытанні, а не хавацца ў цень. Ды пра што гаварыць, калі ведамства Барадзіна за гэты час не прыдумала герб, сцяг, гімн дзяржавы. Барадзін быў добрым заўгасам, але згубіўся на кіроўнай пасадзе.

**«НН»: Ці ёсць гарантыя таго, што такія войны не паўторацца ў будучыні?**

**СМ:** Няма. Мы нядаўна рабілі апытанне, дык большасць рэспандэнтаў не верыць у тое, што такіх канфліктаў больш не будзе.

**«НН»: Газавая вайна ўдарыла па іміджы Расіі ў вачах беларусаў?**

**СМ:** Так, і вельмі балюча. А вось на іміджы беларусаў сказалася станоўча, бо мы прадэманстравалі, што з’яўляемся самастойнай і моцнай дзяржавай.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**



**Сяргей Мусіенка**

палітолаг, кіраўнік аналітычнга цэнтра «ЕсооМ», блізкага да Лукашэнкавай адміністрацыі. Цэнтр узнік перад пачаткам рэферэндуму 2004 аб падаўжэнні прэзідэнцкіх паўнамоцтваў А.Лукашэнкі. Выявілася, што «ЕсооМ» — гэта брэнд, гандлёвая марка фірмы «Медыяфакт–ЭКА», якой кіруе Сяргей Мусіенка. Цэнтр, сярод іншага, займаецца сацыялагічнымі даследаваннямі. Напрыклад, 19 сакавіка 2006 эксперты «ЕсооМ» сцвярджалі, што 84,2% апытаных пры выхадзе з выбарчых участкаў аддалі свае галасы за Аляксандра Лукашэнку. Цікава, што Мусіенка набыў хату першага прэзідэнта Ізраіля Хаіма Вейцмана ў вёсцы Моталь.

## Сцісла

• **Тарэса Собаль: Гэта псіхалагічная атака на мяне.** 28 чэрвеня ў хаце актывісткі непрызнанага Саюза палякаў Беларусі Тарэсы Собаль у Івянцы прайшоўператрус у рамках крымінальнай справы па абвінавачванні ў злоўжываннях.Ператрус праходзіў з санкцыі пракурора. Кіраваў ім следчы Валожынскага РАУС Аляксандр Шульга.

• **«Малады фронт» застаецца самай вядомай арганізацыяй моладзі.** Паводле дадзеных НІСЭПД, найбольшую вядомасць у грамадстве маюць праўладныя маладзёжныя арганізацыі: Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі (63,7%), Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя (12,9%). З незалежных маладзёжных аб’яднанняў трохпрацэнтны бар’ер статыстычнай памылкі пераадолеў толькі «Малады фронт» (8,3%).

• **Бакіеў: За прабыванне, харчаванне і пражыванне мы плацім самі.** «Я адразу заявіў Лукашэнку, што абузай тут не буду», — заявіў Курманбек Бакіеў. Прэс-канферэнцыя зрынутага прэзідэнта Кыргызстана ў гатэлі «Вікторыя» каштавала для Бакіева 1 мільён 400 тысяч рублёў.

**АП, ЗП**

# «Мінск-сіці» забудуюць таннымі «панэлькамі»?

**Інвестары атрымлівалі льготы пад інавацыйнае будаўніцтва, а ўзвядуць звычайныя панэльныя дамы.**

Першыя ахвотныя пасяліцца ў самым прэстыжным месцы сталіцы — што хаваць, і ўсёй краіны! — раёне «Мінск-сіці», могуць радасна пляскаць у ладкі. Агенцтвы нерухомасці пачынаюць браняванне кватэр у жылых дамах комплексу. Першай ластаўкай стаў «Цэнтр гандлю нерухомасцю «Пакадан». Рыэлтары зрабілі патэнцыйным пакупнікам камерцыйную прапанову і заадно паведамілі нечаканыя акалічнасці будаўніцтва.

Першы дом «Мінск-сіці» будзе 19-павярховай... «панэлькай»! З коштам «ад $1000 за квадратны метр». І панэльны дом у раёне пабудуюць далёка не адзін.

### «Вярніце хмарачосы!»

Трывогу сталі біць у інтэрнэце. Людзі перадусім абураныя таямнічай заменай планаў гарадскіх уладаў у апошні момант. «Мне толькі што так страшна-страшна стала... Аказваецца, «Мінск-сіці» будзе зусім не такім, якім вы хочаце яго бачыць. Генпадрадчык там МАПІД, вызначаныя панэльныя серыі пад забудову. І гэта сіці, будучыня так бы мовіць, перспектыва беларускага будаўніцтва, інавацыі... Навошта ашуквалі?» — піша карыстальнік Vipmakler з onliner.by.

«Што за панэлькі ў сіці? Дзе праслаўтыя хмарачосы? Як жа дасталі гэтыя гора-інвестары...» — паўтарае ўслед за ім Groznik з skyscrapercity.com.

Галоўным інвестарам непабудаванага раёна з'яўляецца расійская «Ітэра». Да 2020 года планавалася пабудаваць 4 мільёны квадратных метраў жылых, офісных і гандлёвых плошчаў. Агульная сума інвестыцый мусіла скласці $5 мільярдаў. Для рэалізацыі праекту было створана СААА «Мінск-Сіці», удзельнікамі якога з расійскага боку, апроч «Ітэры», сталі кампаніі «СУ-155» і «МА «Унукава», «Знешэканамбанк» і Банк ВТБ.

Кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка, незадаволены нулявымі тэмпамі будаўніцтва, пагражаў адабраць у расіян прэстыжную пляцоўку, але план не рэалізаваў, бо «Ітэра» паабяцала пачаць будаўніцтва ў другой палове гэтага года.

### Чарга на «панэль»

У «Пакадане» не бачаць ніякай праблемы ў тым, што па тэлебачанні мінчанам абяцалі хмарачосы, а пабудуюць панэлькі: «Хто вам сказаў, што гэта элітныя дамы? Звычайны раён. Будуць і каркасныя дамы, і тыпавыя панэльныя, і офісныя. Пакуль што мы проста рэкламуем дом і рыхтуем дакументы на будаўніцтва. Людзі цікавяцца прапановай і ўжо займаюць чаргу».

— «Ці прадугледжаны зніжкі для людзей, якія маюць правы на паляпшэнне жыллёвых умоў?»

— «Такой інфармацыі няма».

У камітэце па будаўніцтве і інвестыцыях Мінгарвыканкама параілі звярнуцца да генеральнага плана развіцця Мінска, маўляў, якія дамы намаляваныя там, такія і будуць пабудаваныя.

Што ж у генплане? На ім сапраўды можна ўбачыць аднолькавыя панэльныя дамы, якія знаходзяцца на адлегласці некалькі дзясяткаў метраў адзін ад аднаго. Выгляд з акна не парадуе жыльцоў — штодзень ім прыйдзецца бачыць шматузроўневую транспартную развязку. Пра стан экалогіі можна нават не заікацца. Дарэчы, выхад з пад'езда знаходзіцца на тым самым «дарожным» баку.

Сярод пераваг дома — невялікі метраж, прываблівы для сярэдняга класа. Аднапакаёўкі плошчай 45 м², двухпакаёўкі — 61 м² і трохпакаёўкі — 78 м². Разам з невысокім коштам жылля (ад $1000) прапанова, безумоўна, знойдзе свайго купца.

Дом павінен быць здадзены ў канцы 2011 года, прычым з поўным адштукаваннем. На льготны 5%-ны крэдыт мінчане, хутчэй за ўсё, разлічваць не могуць, бо Мінгарвыканкам не дазваляе браць яго тым, хто будуецца ў панэльных дамах. Падтрымка дзяржавы распаўсюджваецца на каркасныя дамы.




**Генеральны план. Дамы на месцы аэрапорта.**



**Фасад дома.**

## Еўрарамонт зноў адкладаецца

**Заданне Лукашэнкі пра пераход на еўрастандарты ў будаўніцтве так і не выкананы.**

Яшчэ два гады таму кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка даваў даручэнне ўвесці ў праектаванні і будаўніцтве нормы і прынцыпы, прынятыя ў Еўрасаюзе. З таго часу змянілася што заўгодна — але не тыя стандарты. Чарговая гадзіна «Х» прызначаная на 1 жніўня, але відавочна, што галіна не падрыхтаваная да еўрарэформаў.

Адной з тэндэнцый развіцця будаўнічай галіны ў еўрапейскіх краінах можна назваць адмову ад стварэння новых панэльных дамоў. Захад ужо досыць даўно не ўзводзіць недаўгавечныя, неэнэргаэфектыўныя і — што хаваць — не надта прыгожыя дамы.

Беларусь жа працягвае нарошчваць тэмпы такой будоўлі.

**Яўген Васількоў**

# Пяройдзем на звадкаваны газ з Клайпеды?

**Працяг са старонкі 1.**

### Сумесны тэрмінал

Пра магчымасць выкарыстання газу нашай краінай загаварылі на мінулым тыдні, калі ў Вільні адбыліся перамовы прадстаўнікоў міністэрстваў энергетыкі Літвы і Беларусі. Іх вынікам стала прынцыповая згода літоўскага боку на сумеснае выкарыстанне тэрміналу звадкаванага газу, які цяпер будуецца ў літоўскай Клайпедзе.

«Мы гатовыя дапамагчы, улічваючы інтарэсы Беларусі», — адзначыў міністр энергетыкі Літвы Арвідас Секмокас. Адной з умоў літоўскага боку ёсць адмова Беларусі ад будаўніцтва АЭС каля мяжы краін. Беларускі бок настроены катэгарычна: атамную электрастанцыю — будаваць.

Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі зазначыў, што «звадкаваны газ — адзін з накірункаў энергетычнай стратэгіі Беларусі». Праўда, па яго словах, існуе яшчэ 2—3 альтэрнатыўныя варыянты.




Еўрапейскія краіны набываюць звадкаваны газ у Катары па цане $174—176 за тысячу кубаметраў. Беларусь у наступным годзе мае плаціць Расіі $210 за газ звычайны. На першы погляд, катарскі варыянт выглядае больш выгадным. Але ўзнікае пытанне дастаўкі газу ў нашу краіну. Па словах Сяргея Сідорскага, краіны могуць пабудаваць тэрмінал у Клайпедзе за супольныя грошы. «Дастаўка будзе ажыццяўляцца праз Літву. Гэта каля 285 кіламетраў магістральнай трубы. Невялікія сродкі», — падсумаваў ён. Цяперашнім газаправодам карыстацца будзе немагчыма, бо зараз ён працуе ў рэжыме экспарту газу з Беларусі ў Літву.

### Што танней?

Найбуйнейшым у свеце экспарцёрам звадкаванага прыроднага газу з'яўляецца Катар. Ён пастаўляе паліва ў Японію, Паўднёвую Карэю, Кітай, Індыю, Вялікабрытанію і іншыя краіны.

Год таму Польшча падпісала 20-гадовую дамову з Катарам на суму $550 мільёнаў штогод. Згодна з умовамі кантракта, у Польшчу будзе пастаўляцца звадкаваны газ у аб'ёмах каля 1,5 мільярда кубаметраў у год на працягу 20 гадоў, пачынаючы з 2014 года. Яго будуць прывозіць танкерамі ў польскі порт Свінауйсце. Выходзіць, што цана для палякаў складзе $367 за тысячу кубаметраў.

Аляксандр Лукашэнка агучвае зусім іншыя лічбы. Па яго словах, «еўрапейцы купляюць газ за $175». Гэта кошт продажу газу непасрэдна ў краіне-экспарцёры. Перавозка звычайна каштуе яшчэ каля $80—100. Сёлета ў пачатку года склалася сітуацыя, што тысяча кубаметраў расійскага газу з трубы для ЕС каштавала $300, а звадкаваны катарскі — усяго $250.

Для параўнання, цяперашні кошт расійскага газу для Беларусі складае $184, а на наступны год «Газпром» зацвердзіў гранічную цану на ўзроўні $250 за тысячу кубаметраў.

Імаверна, кошт катарскага і расійскага прадукта для Беларусі будзе супастаўным. Разам з тым, дыверсіфікацыя паставак выглядае станоўчым фактам для нашай краіны. Меншая газавая залежнасць ад Расіі будзе спрыяць эканамічнай бяспецы.

**Яўген Васількоў**

### Сцісла

• **Danone перадумаў будаваць завод у Беларусі.** Гаворка ішла аб стварэнні беларуска-французскага прадпрыемства па глыбокай перапрацоўцы малака ў Кіраўскім раёне Магілёўскай вобласці. Кошт праекта ацэньваўся ў $20 мільёнаў.

• **Adidas адкрые вытворчасць у Бабруйску.** Швейная фабрыка «Славянка» заключыла кантракт на пашыў спартыўнага адзення «Адыдас». Праца над першай партыяй пачнецца праз два—тры тыдні.

• **Літоўскі гіпермаркет «ОМА» адкрыўся ў Мінску на выездзе на Брэсцкую шашу.** Ён стаў найбуйнейшай будаўнічай крамай краіны. На цырымонію адкрыцця прыехаў прэм'ер-міністр Літвы Андрус Кубіліюс.

• **Крэдытная лінія ў $15 млрд — стрыжань беларуска-кітайскіх адносінаў.** Пра гэта заявіў віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка. Праўда, сума выглядае пражэкцёрскай. За 2003—2009 гады ў эканоміку Беларусі надышло кітайскіх інвестыцый усяго прыкладна на $232 млн.

• **Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ, які спросціць працэдуру банкруцтва.** Указ №328 мае назоў «Аб некаторых мерах па аптымізацыі правядзення працэдур эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтва)».

• **Еўракамісія выявіла змову вытворцаў сантэхнікі ў ЕС.** 17 кампаній утварылі таемны картэль, каб трымаць высокія цэны на сваю прадукцыю. Круцялёў пакаралі штрафам на агульную суму 622 млн еўра.

**ЯВ**

# 85% супрацоўнікаў мінскага АМАПа забяспечаныя жыллём

**24 чэрвеня ў ваенным гарадку «Уручча» ў Мінску ўведзеныя ў эксплуатацыю два 111-кватэрныя службовыя жылыя дамы для супрацоўнікаў АМАПа.**

Яны пабудаваныя ААТ «МАПІД» крыху больш чым за год непасрэдна на тэрыторыі базы палка.

У цырымоніі ўзялі ўдзел міністр унутраных справаў Анатоль Куляшоў, начальнік мінскай міліцыі Леанід Фармагей, будучыя жыхары.

Міністр заявіў, што дзяржава робіць усё, што ад яе залежыць, каб міліцыя ні ў чым не мела патрэбы.

Па словах намесніка камандзіра АМАПа Аляксандра Кашталанава, у эксплуатацыю здадзеныя 222 кватэры, з якіх на кожным паверсе па дзве двухпакаёвыя, па адной аднапакаёвай і адной трохпакаёвай кватэры. У дамы заселеныя, дадаў ён, 208 супрацоўнікаў палка, а таксама міліцыянты іншых падраздзяленняў, якія супрацоўнічаюць з АМАПам.

«На сённяшні дзень ужо 85% асабістага складу палка забяспечаныя жыллём, — дадаў Кашталанаў. — У бліжэйшы час тут жа мяркуецца будаўніцтва яшчэ двух жылых дамоў».

**БелаПАН**



**Актывісты кампаніі «Гавары праўду» 24 чэрвеня наведалі летнік Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі пад Ракавам. Летнік арганізаваны для падрыхтоўкі бээрэсэмаўцаў да выбараў. Таму «праўдалюбы» хацелі перадаць маладым людзям маніторынг парушэнняў заканадаўства падчас мінулых выбараў. Але дарогу актывістам перагарадзілі спецназаўцы. Пагаварыць з нечаканымі гасцямі выйшаў толькі начальнік аддзела па справах моладзі Мінгарвыканкама Віталь Брэль. На фота злева: актывіст «Гавары праўду» Юрась Алейнік.**

## Вясельны фатограф з Гомеля выявіўся педафілам

**Ён і яго замежны партнёр сядуць у турму.**

29 чэрвеня суд Цэнтральнага раёна Гомеля абвясціў выракі двум педафілам — 10 і 13,5 гадоў пазбаўлення волі. Суд таксама задаволіў грамадзянскія пазовы бацькоў пацярпелых дзяцей. Кожнаму з іх выплацяць па 10 млн рублёў.

На лаве падсудных апынуліся грамадзянін Беларусі і грамадзянін Ізраіля. Абодва ўраджэнцы Гомеля. Іх затрымалі 19 мая. Затрыманню папярэднічала працяглае следства, распачатае пасля звароту суседкі аднаго з педафілаў. Яна заўважыла, што ў кватэру да 27-гадовага халасцяка часта ходзяць хлопчыкі з бедных сем'яў. Суседка звярнулася ў міліцыю. У выніку арыштавалі спачатку ўласніка кватэры, а потым яго сябра — 47-гадовага ізраільцяніна.

У іх сканфіскавалі кампутары, фота- і відэакамеры, дыскі. На CD знайшлі парнаграфію. Следства выявіла і пацярпелых — шэсць хлопчыкаў.

Падсудныя віны не прызналі. Яны заяўлялі, што яны — гомасэксуалісты, але проста любяць дзяцей і запрашалі іх да сябе, каб пачаставаць цукеркамі і даць пагуляць у камп'ютэрныя гульні. Аднак медыцынская экспертыза пацвердзіла — педафілія. У суда не засталося сумневаў.

Маладзейшы педафіл быў вядомым у горадзе вясельным фатографам. Падчас працы яму часта дапамагалі малыя, аднак ніхто на такое дзівацтва не зважаў.

**Алесь Пілецкі**

## З Ладуцькі знялі прыдомак «в.а»

У пятніцу Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў на пасадзе старшыні Мінскага гарвыканкама Мікалая Ладуцьку. В.а. ён стаў адразу пасля хваробы Паўлава, але прызначаць яго Лукашэнка не спяшаўся.

Ладуцька з мінскіх, нарадзіўся ў 1959-м. Скончыў Політэхнічны інстытут. У савецкі час рабіў кар'еру ў камсамоле, але своечасова сышоў.

З 1990 па 2003 — начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела будупраўлення №256 МАПІД «Мінскжылбуд». Сфера дзяржаўнага будаўніцтва — адна з найбольш карумпаваных, аднак Ладуцька выйшаў з яе чысты.

**ЗП**

# Завод разварушыў народ

**Жыхары вёскі Шырокая на Лідчыне, якія змагаюцца супраць будаўніцтва шкоднага хімічнага прадпрыемства ля сваіх дамоў, не пусцілі на парог раённага ідэолага.**

Людзі пратэстуюць супраць плану паставіць за іх гародамі завод гарачага цынкавання металаканструкцый. Ім нарэшце пачалі прыходзіць адказы з розных інстанцый.

Лідскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі адказаў, што да 2011 года будуць праведзены папярэднія працы па распрацоўцы санітарна-абарончай зоны і меркаванні насельніцтва пра будаўніцтва прадпрыемства ўлічаць.

З Мінпрыроды прыйшоў адказ, што будзе праведзены аналіз месца для альтэрнатыўнага размяшчэння прадпрыемства. Пішуць і пра магчымасць правядзення грамадскіх слуханняў.

«Не верыцца, што яны прышлюць нам незалежных экспертаў, — кажа Валянціна, жыхарка Шырокай. — Зноў напрыязджаюць «акадэмікі», раскажуць, як усё бяспечна».

Людзі працягваюць збіраць подпісы супраць будаўніцтва завода, які плануюць пабудаваць за 300 метраў ад вёскі Шырокая і за 800 метраў ад Ліды. На сёння ўжо сабрана 2800 подпісаў ад жыхароў вёсак Гарні, Шырокая, Даліна, Астроўля і самой Ліды. Людзі падпісваюцца ахвотна. З пяцідзесяці адмаўляецца адзін-два чалавекі, часцей старыя, якія баяцца выступаць супраць улады.

Найбольшая праблема ў тым, што большасць лідчукоў папросту не чула ні пра завод, ні пра гарачае ацынкаванне металу.

Адзіным грамадскім рухам, які павёў сябе палітычна ў дачыненні да лідскай праблемы, стала ініцыятыва «Гавары праўду». Яе актывісты збіраюць подпісы з патрабаваннем грамадскіх слуханняў з удзелам усіх зацікаўленых асобаў. Таксама 539 подпісаў ад жыхароў Лідчыны было перададзена Сяргею Сідорскаму і Міхаілу Мясніковічу з просьбай даць гарантыі, што прадпрыемства не будзе прадукаваць шкодных выкідаў у атмасферу і ваду. Яшчэ адзін ліст з подпісамі рыхтуюць да мясцовага дэпутата. Яго ж абавязак — бараніць інтарэсы жыхароў.

Жыхары Гарнёў і Шырокай шчыра радуюцца, што іх гісторыя зацікавіла людзей і да іх завіталі журналісты з незалежных выданняў і лідэр «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў. Акрамя журналістаў і «праўдалюбцаў», завітвала і супрацоўніца ідэалагічнага аддзела райвыканкама. Праўда, на першым прыездзе людзі нават не пусцілі яе на парог. Так завод гарачага ацынкавання металу разварушыў некалькі вёсак.

**Настасся Шамрэй**

## Здарэнні сцісла

**• Беспрацоўны Лукашэнка краў туі.** У Мінску гіцлі пачалі красці дрэвы. Так, на Кургане Славы ў ноч з 22 на 23 чэрвеня знікла 21 туя на агульную суму 945 тысячаў рублёў. А трохі раней «налёт з рыдлёўкай» быў здзейснены на тэрыторыю прадпрыемства «Шчомысліца» Беларускага дзяржуніверсітэта. Там былі выкрадзеныя 4 елкі і 15 туяў на 900 тысячаў. Падазраецца 40-гадовы беспрацоўны жыхар вёскі Шчомысліца В.В.Лукашэнка. Частка выкрадзенага была знойдзеная на яго падворку. Затрыманага праверяць на датычнасць і да крадзяжу з Кургана Славы.

**• Гродзенскі кіроўца здзейсніў антырэкорд.** 31-гадовага мужчыну затрымлівалі за парушэнне ПДР 20 разоў. Палова затрымання — кіраванне ў нецвярозым стане. З лютага 2007 года ён быў пазбаўлены пасведчання кіроўцы на 5 гадоў.

**• За ўчастак давалі 25 тысяч еўра хабару.** Два дырэктары прыватных прадпрыемстваў Мінска падбухторвалі кіраўніка будаўнічай кампаніі да давання хабару службовым асобам за дазвол выдзеліць зямельны ўчастак пад будаўніцтва жылога дома ў цэнтры сталіцы. Іх затрымала опергрупа ў момант атрымання хабару ў 25 тысяч еўра. Затрыманыя знаходзяцца ў следчым ізалятары КДБ.

**• Трохгадовы хлопчык захлынуўся ў ванне.** Трагедыя адбылася ў Бабруйску. Бацькі на пару хвілін пакінулі малога без нагляду ў ванне. Выратаваць яго не ўдалося.

**• Смерць ад аголенага дрота пральнай машыны.** Труп 45-гадовага жыхара вёскі Любонічы без прыкметаў гвалтоўнай смерці быў знойдзены ў ванне яго дома. Паводле папярэдняга заключэння, смерць надышла ад удару токам з аголенага дрота ўключанай пральнай машыны.

**• Касірка абабрала кліента.** 21-гадовая жыхарка Свіслачы (Гродзенская вобласць) паўстане перад судом за крадзеж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі і службовы падлог. Працоўныя спецыялістам па аперацыйна-касавай працы аддзялення аднаго з банкаў у вёсцы Новы Двор, дзяўчына выкрала 3 млн рублёў з рахунку мясцовага жыхара. Каб утаіць крадзеж, яна ўпісала несапраўдныя звесткі ў касавыя ордэры.

**• Гарэў Парк высокіх тэхналогій.** На тэрыторыі Парка высокіх тэхналогій у Мінску адбыўся пажар. Мінакі заўважылі густы чорны дым, які падымаўся з вокнаў будынка ПВТ па вуліцы Акадэміка Купрэвіча. У офісе кампаніі EPAM Systems, якая месціцца ў ПВТ, паведамілі, што прычынай пажару сталі будаўнічыя работы ў двары будынка: будаўнікі падпальвалі смалу. Пажар лакалізавалі, пацярпелых няма.

**• Невядомы замінаваў аэрадром Баравая пад Мінскам у час фестывалю электроннай музыкі GlobalGathering.** Удалося высветліць, што паведамленне было падманным, а таксама ўстанавіць асобу падазронага — ім аказаўся жыхар Мінска. Ахова фестывалю не пусціла яго на дыскатэку, бо ў яго не было білета, і, відаць, каб адпомсціць, той вырашыў сарваць імпрэзу.

**• Забіўся спецназавец, скокнуўшы з парашутам.** Прычым гэта быў не зялёны шараговец, а прапаршчык аднаго з мабільных злучэнняў сіл спецыяльных аперацый Узброеных сіл. Ён атрымаў траўмы, несумяшчальныя з жыццём.

**Страхар сарваўся з дзявятага паверха.** 36-гадовы мужчына, страхар УП «ЖРЭА», падчас правядзення работ сарваўся з даху дома на вуліцы Адзінцова. Ад атрыманых траўмаў ён памёр на месцы.

**СМ; БелаПАН, naviny.by, «Еўрарадыё», блог «Гродна s13»**

# Цана чалавечай памылкі

**Уругвайскі арбітр Хорхе Ларыёнда ў матчы 1/8 фіналу чэмпіянату свету паміж зборнымі Англіі і Германіі не пабачыў чыстага гола Фрэнка Лэмпарда.**




### Усе крытыкуюць Блатэра

Гэты момант адбыўся на 38-ай хвіліне гульні. Немцы надзвычай упэўнена пачалі гульню. Намаганнямі натуралізаваных палякаў **Клозе** і **Падольскага** каманда **Яхіма Лёва** выйгравала 2:0. Нішто не гаварыла пра тое, што можа грымнуць бяда.

Але спачатку цэнтральны абаронца англічан Апсан адыграў адзін мяч, а літаральна праз хвіліну бабахнуў **Лэмпард**. Мяч трапіў у папярэчыну, ад якой адскочыў у вароты, а потым прыскакаў да варатара. Англічане радасна ўскінулі рукі ўгору, але ўругвайскі арбітр паказваў, што гульню можна працягваць.

Паўтор засведчыў, што мяч дзесьці на паўметра перасек стужку варот. Арбітры гэтага не заўважылі.

Яшчэ ў сакавіку сёлета пытанне аб увядзенні на матчах відэапаўтораў разглядалася Міжнароднай радай футбольных асацыяцый. Цікава, што тады на ўвядзенні такога элемента настойвалі акурат англічане і шатландцы. Але іхняя прапанова была адхіленая.

Рашучым праціўнікам паўтораў з'яўляецца прэзідэнт ФІФА швейцарац **Зэп Блатэр**. На ягоную думку, гэта знізіць тэмп гульні, зробіць яе больш рванай, менш цэласнай.

«Здаецца, без паўтораў усё ж не абысціся», — сказаў пасля гульні Англія — Германія Блатэр.

Славуты беларускі арбітр **Вадзім Жук** кажа, што да апошняга часу з'яўляўся праціўнікам відэапаўтораў. «Але цяпер перагледжу сваё стаўленне да праблемы», — кажа ён.

Відэапаўторы існуюць у хакеі, тэнісе, і гэта абсалютна не замінае спартоўцам. Наадварот, робіць гульню больш справядлівай. Але ці настолькі будзе цікавым футбол, калі з яго цалкам выключыць фактар чалавечай памылкі?

Легендарны немец **Франц Бекенбаўэр** лічыць, што не будзе. «Адзін з плюсаў футбола — гэта драматычнасць, гэта не ідэальная гульня. Усе футбалісты дапускаюць памылкі, і гэта дадае футболу эмоцый», — кажа **Бекенбаўэр**.

### Наступнік Тофіка Бахрамава

Калі **Ларыёнда** не пабачыў англійскі гол, то заўзятарам са стажам адразу ўспомніўся вечар 30 ліпеня 1966 года. Тады на славутым стадыёне «Уэмблі» ў Лондане ў фінале чэмпіянату свету сышліся якраз зборныя Германіі і Англіі. Лінейным арбітрам гульні быў азербайджанец **Тофік Бахрамаў**.

Асноўны час матча скончыўся ўнічыю 2:2. А ўжо ў дадатковы англічанін **Хёрст** трапіў у перакладзіну, а затым мяч ад лініі варот адскочыў у поле.

Галоўны суддзя пабег да памочніка. І Бахрамаў кіўком галавы пацвердзіў, што мяч перасек стужку. Спрэчкі немцаў былі марнымі. У той вечар англічане ўпершыню сталі чэмпіёнамі свету.

Увесь гэты час не суніміліся спрэчкі, дык ці быў тады гол. Сам Хёрст кажа, што не пэўны ў гэтым. Ёсць сумневы яшчэ і таму, што той самы Хёрст падарыў сыну Бахрамава сваю майку, дзе па-азербайджанску было напісана: «Вялікі дзякуй».

Тым не менш, для Азербайджана фігура Тофіка Бахрамава знакавая. У 2004 годзе ў Баку гэтаму арбітру быў адкрыты нават помнік. Сэр Джэф Хёрст быў на яго адкрыцці.

Можа, гэткім чынам лёс вяртае немцам даўжок?

### Нямецкі інтэрнацыянал

Зрэшты, пасля такога штурму англічан магла пасыпацца любая зборная, але не немцы. У другім тайме каманда Яхіма Лёва зняла ўсе пытанні пра пераможцу. Дзве хуткія атакі, кропкі ў якіх ставіў футбаліст з тыповым нямецкім прозвішчам **Мюлер**, — 4:1. Немцаў у чвэрцьфінале чакае Аргенціна **Дыега Марадоны**.

Цікава, што ледзьве не палова складу нямецкай зборнай — гэта выхадцы з іншых краінаў. Галы англічанам забілі палякі Клозе і Падольскі, трэці паляк **Трахоўскі** быў у запасе. Бліскучай гульнёй вылучаўся турак **Месут Азіл**, ягоны суайчыннік **Сердар Тэскі** чакаў выхаду на поле. Таксама ў складзе «бундэсшафт» нігерыец **Аога**, ганіец **Боатэнг**, серб **Марын**, тунісец **Хедзіра**, бразілец **Какау**, іспанец **Гомес**.

Большасць з іх нарадзіліся і склаліся як асобы ў Германіі. Такія рэаліі сучаснай Еўропы, дзе імігранты граюць усё большую ролю ў грамадскім, палітычным, культурным, спартовым жыцці.

А хуткасныя, мабільныя немцы спадабаліся. Значная частка гульцоў зборнай яшчэ летась сталі чэмпіёнамі Еўропы сярод моладзі, а сёння ўжо вызначаюць гульню галоўнай каманды.

Нават калі гэты чэмпіянат будзе не за імі, то ў немцаў усё адно застаецца выдатная перспектыва.

Дарэчы, голам у вароты англічан Міраслаў Клозе ўвайшоў у гісторыю. Ён дагнаў самога **Пеле** па колькасці забітых мячоў на сусветных чэмпіянатах. Цяпер у абодвух па 12. Зрэшты, Клозе яшчэ ў ПАР можа выйсці наперад.

**Зміцер Панкавец**

# Топ-5 шчаслівуцаў і няўдачнікаў чэмпіянату

**Групавы этап і матчы плэй-оф дазволілі гаварыць пра першых шчаслівуцаў і няўдачнікаў першынства.**

**1.**

**ШЧАСЛІЎЦА.** 23-гадовы нападаючы мадрыдскага «Рэала» і зборнай Аргенціны **Гансала Ігуаін (на фота)** пакуль адзіны футбаліст на мундыялі, хто адзначыўся хет-трыкам (тры галы ў адным матчы). Ад ног і галавы аргенцінца пацярпела Паўднёвая Карэя. А з улікам гола, што Ігуаін забіў мексіканцам, ён выйшаў на першае месца сярод бамбардзіраў першынства.

Так форвард аддзячыў за давер трэнеру Дыега Марадону. «Я хацеў бы забіць на турніры столькі, колькі ўжо забіў. Бо калі ў найлепшага бамбардзіра першынства ўсяго пяць-шэсць галоў — гэта сумна», — кажа Гансала.

**НЯЎДАЧНІК.** А вось «чалавек-гол» зборнай Англіі Уэйн Руні пакідае першынства, так ні разу і не засмуціўшы варатароў супернікаў. Трэнер англічан італьянец Фабіа Капэла бачыў, што гульня Руні зусім не ідэальная, але не адважваўся пакінуць форварда ў запасе. Увіце, які шквал крытыкі абсыпаўся б на «коўча», каб зборная прайграла без Руні.

**2.**

**ШЧАСЛІЎЦА.** Уругвайцы пачалі першынства з нулявой нічыёй з французамі. Пэўна, сваю ролю сыграў аўтарытэт «трохкаляровых». А вось потым паўднёваамерыканская дружына раскачагарылася і атрымала тры перамогі запар. І вырашальную скрыпку ў ёй граюць форварды Луіс Суарэс і Дыега Фарлан. Абодва забіваюць прыгожыя галы.

Уругвай — двухразовы чэмпіён свету, але было гэта ўжо вельмі даўно (1930, 1954). У чвэрцьфінал уругвайцы не выходзілі з 1970 года.

**НЯЎДАЧНІК.** Зборная Францыі на турніры зганьбавалася, прайграўшы Мексіцы і ПАР. Галоўны трэнер французаў Раймон Даменек зрабіў «ахвярным казлом» форварда Нікаля Анэлька.

Нападаючы быў адлічаны са складу віцэ-чэмпіёнаў свету за брыдкаслоўе на адрас трэнера. Але гэтая мера не дапамагла. Французы на мундыялі былі абсалютна бездапаможнымі. Беларусам бы такія французы ў суперніках у верасні.

**3.**

**ШЧАСЛІЎЦА.** Колькі ўжо спадзяванняў на гэтым першынстве ўскладалася на афрыканскія каманды. А апраўдаць іх змагла толькі зборная Ганы, якая выйшла ў чвэрцьфінал.

Галоўнай зоркай ганійцаў ёсць 25-гадовы форвард заштатнага французскага «Рэна» Азамоа Гян. Менавіта яго трапныя ўдары прынеслі перамогу над Сербіяй і ЗША, а таксама нічыю з Аўстраліяй.

У чвэрцьфінале супернік Ганы таксама не самы грозны — Уругвай. Ёсць магчымасць развіць поспех.

**НЯЎДАЧНІК.** Зборная Кот-д'Івуара была вартая выхаду з групы, але занадта моцнай яна ёй трапілася. Каб выйсці ў плэй-оф, трэба было выйграваць у Партугаліі, але еўрапейцы стрымалі ціск афрыканцаў.

Галоўная зорка «сланоў» Дзідзье Драгба перад самым мундыялем атрымаў траўму. Страціць такога гульца было б вельмі прыкра, таму нават ФІФА пайшло яму насустрач, дазволіўшы гуляць у адмысловай шыне на руцэ. Драгба забіў толькі бразільцам, але гэтага было замала.

**4.**

**ШЧАСЛІЎЦА.** Дэбютант мундыяляў зборная Славаччыны нарабіла шораху сваім выхадам у 1/8 фіналу. Самая блізкая геаграфічна да Беларусі каманда, што ўдзельнічае на чэмпіянаце, выбіла з турніру не каго-небудзь, а чэмпіёнаў свету з Італіі! У той феерычнай гульні форвард Роберт Вітэк аформіў дубль, чым пахаваў надзеі апеніцаў. Агулам на турніры Вітэк стаў аўтарам чатырох мячоў. Гэта, безумоўна, дапаможа яму замяніць, не хапаючы зорак з неба, турэцкі клуб «Анкарагюджу» на мацнейшую каманду.

**НЯЎДАЧНІК.** Італьянцы — галоўнае расчараванне чэмпіянату. Яны не змаглі нават выйсці з групы, якая была далёка не самай моцнай. На Радзіме каманду Марчэла Ліпі сустракалі тысячы раз'юшаных фанатаў. Італьянцам трэба добра пастарацца, каб заслужыць дараванне.

**5.**

**ШЧАСЛІЎЦА.** Японцы ўражваюць лёгкасцю сваёй гульні. Іх цяжка перабегаць, а ў некаторых і тэхніка на ўзроўні бразільскай. Напрыклад, у Кейсуке Хонды. Выкананнем штрафных ён забяспечыў сваёй камандзе перамогі над Камерунам і Даніяй. Дзіўна, што такі бліскучы гулец абараняе колеры маскоўскага ЦСКА, а не вядучых еўрапейскіх каманд.

**НЯЎДАЧНІК.** Паўночныя карэйцы разам з камерунцамі — дзве зборныя, якія не набралі на мундыялі ніводнага пункта. Асабліва шкада было варатара КНДР Ры Мен Гука, які ў сустрэчы з Партугаліяй быў вымушаны дастаць з сеткі цэлых сем галоў. І не абвінавціш у тым галкіпера, проста партугальцам была патрэбная буйная перамога, якой яны і дабіліся.

**Зміцер Панкавец**



# Лукашэнка — Еўропе: «На Расію спадзявацца абсалютна нельга»




Аналітыкі ламаюць дзіды, хто перамог у газавай вайне. Ва ўсякім разе, на «Еўраньюс» дуэль з «Газпромам» Лукашэнка выйграў адназначна. Піша **Аляксандр Класкоўскі**.

Пасля газавае вайны Лукашэнка ўпершыню назваў палітыку Расіі імперыялістычнай. На фота: пакуль «Пагоня» вярнулася толькі на адміністрацыйныя будынкі Віцебска.

Канал «Еўраньюс» паказаў увечары 25 чэрвеня ўсутыч дзве гутаркі — з газпромаўскім споўксмэнам Купрыянавым і з Лукашэнкам. На фоне анемічнага Купрыянава, што прамаўляў драўляныя фразы ў духу «спрэчкі гаспадарчых суб'ектаў», беларускі афіцыйны кіраўнік выглядаў згусткам эмоцый і найперш — праведнага гневу.

Гэта быў той выпадак, калі дастаткова было назваць рэчы сваімі імёнамі.

«У іх вока гарыць на дзяржаўную ўласнасць у Беларусі», — патлумачыў Лукашэнка першую сапраўдную прычыну газавай атакі. Маўляў, «хочуць прыхапіць яе за бесцань». Другая ж прычына — «ім не падабаецца тут Лукашэнка». Ну, і трэцяе — «асабістыя матывы, пра якія вы таксама добра ведаеце».

Увогуле, выйшла не столькі пра газ, колькі пра выбары. «Усё абсалютна зразумела. Ідзе ціск напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі. І наша апазіцыя, і яны [расейцы] мяркуюць, што Лукашэнка дзеля захавання ўлады перад выбарамі, каб Лукашэнку Крэмль падтрымаў і прызнаў, здасць усё», — патлумачыў ён карэспандэнту «Еўраньюс», якога па-свойску называў Аляксеем.

Пра абарону незалежнасці, імперскае мысленне Крамля ды жаданне ўтрымаць Беларусь у сферы свайго ўплыву гаспадар кабінета казаў у такіх выразах і так палымяна, нібы ягонымі вуснамі прамаўляў сам Зянон Пазняк.

Сутнасць крамлёўскага падыходу да Беларусі была сфармулявана пяццю інфінітывамі запар: «Узяць, скруціць, нахіліць, прыціснуць, задушыць». Усё было горача і пераканаўча. Еўропа ўбачыла змагара-незалежніка.

Заадно ён падкрэсліў, што еўрапейцам варта болей інтэнсіўна шукаць альтэрнатыўныя шляхі пастаўкі вуглевадароднай сыравіны: «На Расію спадзявацца абсалютна нельга».

Аднак Еўропа не пачула ні слова пра тое, чаму з такой брыдкай, невылечнай, драпежнай імперыяй мудрае кіраўніцтва сінявокай рэспублікі 15 гадоў гуляе ў «раўнапраўную інтэграцыю». І не выключана, што яшчэ глыбей засуне суверэнітэт у імперскую пашчу, падпісаўшы пасля выбрыкаў Мытны саюз.

## Лепш наменклатурная прыватызацыя, чым ніякай

**Алесь Чайчыц** адказвае на артыкул Сяргея Богдана «Ціхая прыватызацыя як сродак экспрапрыяцыі нацыянальнага багацця» з №23.

Калі мы хочам, каб «Беларуськалій», «Белшына», беларуская нафтаперапрацоўка былі і надалей канкурэнтаздольнымі на міжнародным узроўні, яны ўсё роўна павінны быць па максімуме прыватызаваныя.

Дзяржава не здольная эфектыўна кіраваць рынкавымі прадпрыемствамі — гэта факт, які вядомы і студэнтам першага курса эканамічнага ўніверсітэта.

Іншая рэч, што ў ідэале:

1) прыватызацыя павінна быць крыштальна празрыстай: прадаваць трэба па частках на адкрытым аўкцыёне ці, яшчэ лепей, шырокаму колу інвестараў праз біржу;

2) продаж павінен адбывацца за максімальна вялікую цану і/альбо мець у якасці формы аплаты абавязальніцтвы па інвеставанні ў кампанію;

3) грошы ад продажу павінны быць сумленна выкарыстаныя на развіццё эканомікі, а не апасці ў кішэнях чыноўнікаў ці пайсці на папулісцкія мерапрыемствы напярэдадні чыёйсьці перадвыбарчай кампаніі.

Згубленасць апошніх пятнаццаці гадоў для беларускай эканомікі ў першую чаргу выражаецца ў тым, што таленавітыя і ініцыятыўныя людзі, якія маглі б пераўтварыцца ў буйны беларускі бізнэс, былі збольшага выціснутыя з краіны і цяпер плоцяць заробкі і падаткі ў Расіі, Польшчы і Чэхіі альбо ўвогуле сядзяць па турмах.

Гэта азначае, што беларускага купца на згаданыя актывы проста няма. А значыць, ёсць важкія падставы меркаваць, што «Беларуськалій» і нафтаперапрацоўка рыхтуюцца да продажу расійскаму ці кітайскаму бізнэсу, якія гатовыя прымаць звязаныя з гэтым рызыкі.

## Тэалагізацыя ўсёй краіны

Ініцыятыва Інстытута тэалогіі БДУ: прадмет «рэлігійная культура» ў школах. Спосаб працаўладкаваць 400 выпускнікоў?

Урокі рэлігійнай культуры ў школе мусяць стаць абавязковым прадметам з выніковым экзаменам, мяркуе начальнік Цэнтра міжнародных сувязяў і развіцця тэалагічнай адукацыі Інстытута тэалогіі БДУ Рыгор Даўгяла. Згодна з яго задумай, вучняў трэба дзяліць: праваслаўным чытаць курс праваслаўнай культуры, каталікам — «з акцэнтам на каталіцкія каштоўнасці», юдэям і мусульманам — адпаведна. Нават атэісты змогуць аддаць дзіця на курсы «свецкай этыкі».

Ён спаслаўся на тое, што рэлігійная адукацыя ёсць у многіх еўрапейскіх краінах. Хто ж будзе вучыць дзяцей духоўнасці? Штогод Інстытут тэалогіі выпускае спецыялістаў. Усяго іх ужо навыпускана 300—400 чалавек. Некаторыя нават працуюць у школах настаўнікамі факультатываў.

Спачатку трэба выбраць пару эксперыментальных школ, кажа Р.Даўгяла. І, вядома, ніякай манаполіі Інстытута тэалогіі на выкладанне не можа быць. «Хай выкладаюць прадстаўнікі усіх афіцыйна дазволеных у Беларусі рэлігій. Ці ёсць, канешне, у іх спецыялісты, гэта да іх пытанне. А мы гатовы ў школы ісці хоць заўтра», — падсумоўвае ён.

**Наста Шамрэй**

## Павал Севярынец: «Мы чулі, што нас за спінай называюць талібамі»

**— У вас у БХД 4 сустаршыні. І калі ў пачатку адраджэння партыі гэты працэс найперш звязваўся з вашай асобай, то апошнім часам вы неяк адышлі ў цень на фоне Віталя Рымашэўскага, які вылучаецца кандыдатам у прэзідэнты ад БХД. Вы наўмысна прыглушаеце сваю ролю дзеля партыі, «дзеля агульнай справы»?**

— Я свядома канвертую свой асабісты патэнцыял у партыйны. І гэта варта рабіць, бо партыя заўсёды зробіць больш, чым адзін чалавек. І калі ў нас ёсць кандыдат у прэзідэнты, ён мусіць быць лідэрам. Таму трэба «саступіць лыжню», каб ён мог весці партыю наперад.

А сустаршынства — гэта пытанне палітычнай культуры. І мы паказваем прыклад, калі 4 чалавекі доўгі час могуць быць на роўных і знаходзіць паразуменне паміж сабой, паспяхова вырашаючы палітычныя пытанні.

**— Тым не менш, дзейнасць БХД апошнім часам сярод вашых калегаў па дэмакратычным лагеры выклікае ўсё большае раздражненне. Вы чулі, што вас за спінай называюць талібамі?**

— Чулі. Але тут не трэба прыгадваць Афганістан, а лепш прыгадаць гісторыю Беларусі. Беларусь — гэта заўсёды было спалучэнне хрысціянскай веры і моцнага дэмакратызму. І сапраўды, рост БХД — гэта факт. Магчыма, ён нават большы, чым разлічвалі нашы паплечнікі. Магчыма, хтосьці думаў, што БХД займе нішу і будзе спакойна ў ёй пасопваць. Але мы хочам стварыць вядучую палітычную сілу, што грунтуецца на хрысціянскіх каштоўнасцях.

Калі ў палітыкуме бачаць сілу, якая набірае вагу, то раздражненне — самае меншае, чаго можна чакаць. Таму мы да гэтага ставімся спакойна. Але мы хочам застацца сілай, якая зыходзіць не з пазіцый гвалту, а з хрысціянскіх пазіцый прапановы альтэрнатывы. І мы лічым, што яскравая прапанова з нашага боку ўрэшце будзе прымацца і перастане выклікаць супрацiў.



**— За сваю палітычную кар'еру вы больш за 40 разоў затрымліваліся міліцыяй і КДБ, агулам правялі пад арыштам больш за 7 месяцаў — і гэта калі не лічыць год і 9 месяцаў «хіміі». Але слухаючы вашы разважанні пра рэлігію, магчыма, некаторыя зададуцца пытаннем — а ці гэта той самы смелы і адважны Севярынец, якім ён быў у 1990-х? Ці прыйдзеце вы на плошчу падчас выбараў?**

— На плошчу я прыйду, гэта адназначна. Веру, што Бог дае смеласць і адвагу нават тым людзям, якія баяцца. І я веру, што беларусы пераадолеюць свой страх.

**Віталь Цыганкоў, «Свободные новости плюс»**

## Справа Байковай — дыягназ сістэме

Піша **Андрэй Пачобут**.

Уяўляю як у СІЗА КГБ Байкова выводзіла гэтыя радкі: «Созданный государством и его Главой правовой механизм борьбы с преступностью, коррупцией набрал силу и нужные обороты, и я не одинока в своем искреннем, не игривом порыве, в основе которого лежит убеждение в правоте начатой Президентом войны с генералами и рядовыми, совершившими правонарушение. И я все шестнадцать лет была и остаюсь с Президентом на его бескомпромиссных позициях».

Чытаеш прашэнне былой следчай на адрас прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і міжвольна насоўваецца параўнанне са сталінскімі часамі, калі «ворагі народа» з былых камуністаў перад смерцю крычалі: «Жыве таварыш Сталін!».

Справа Байковай — гэта сапраўдны дыягназ. Яна як ніякая іншая (б'юць жа аднаго з іх) паказвае лёкайства і бесхрыбетнасць сённяшніх сілавікоў, судоў і ўсяго таго, што прынята называць прававой сістэмай Беларусі.

Яна паказвае, што пасадзіць могуць не толькі апазіцыянера, не толькі таго, хто адмовіцца выканаць загад, могуць пасадзіць нават таго, хто гэтыя загады будзе бліскуча выконваць. Дастаткова толькі, каб у атачэнні Аляксандра Лукашэнкі неяк па-іншаму ляглі карты.

**poczobut.livejournal.com**

## Латушка: У Катыні ляжаць і беларусы

Міністр культуры ўзяў удзел у адкрыцці выставы «Памятаю. Катынь 1940» у Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Трагедыю Катыні нельга не адчуць і нельга не зразумець, лічыць міністр культуры Беларусі Павел Латушка. Паводле яго слоў, эмацыйныя ўражанні ад прэм'еры фільма Анджэя Вайды «Катынь» былі настолькі моцнымі, што адправіў шафёра і пайшоў дахаты пешкі, каб прагуляцца на свежым паветры. «Я ніколі не быў у Катыні, але зразумеў гэты боль», — сказаў міністр.

Ён адзначыў, што ў Катыні ляжаць і беларусы — праваслаўныя і каталікі, якія на 1939 год жылі ў Заходняй Беларусі.

Выстава працуе да 25 ліпеня.

**Сяргей Гезгала**

Меркаванні ў артыкулах на старонцы «Каментары» могуць супадаць, а могуць і не супадаць з меркаваннем Рэдакцыі.

# Дзе жыве Лукашэнка?

**У кіраўніка дзяржавы як мінімум дзесяць рэзідэнцый.**

Кампанія «Трайпл» павінна тэрмінова, да канца 2010 года, узвесці на тэрыторыі Белавежскай пушчы «комплекс збудаванняў па аблугоўванні дэлегацый». Такі загад утрымліваецца ў спецыяльным указе кіраўніка Беларусі.

«Трайпл», што належыць блізкаму да ўлады бізнэсоўцу Юрыю Чыжу, абавязаны збудаваць комплекс у нацыянальным парку задарма. Узамен кампанія атрымае падатковыя льготы. Выглядае на тое, што Аляксандр Лукашэнка хоча займець новую гасцявую рэзідэнцыю ў легендарнай Белавежы, дзе ўжо ёсць не менш легендарныя «Віскулі». Якія яшчэ месцы працы і адпачынку мае кіраўнік дзяржавы?

Асноўнае яго працоўнае месца знаходзіцца ў цэнтры сталіцы. Адрас **«Маркса, 38»** паспеў стаць намінальным назоўнікам. Былы шасціпавярховы будынак ЦК КПБ у народзе завецца «Чырвоным домам». Зрэшты, і ўнутраная тапаніміка звязаная з колерамі. У Белай зале прымаюцца замежныя дэлегацыі, Блакітная і Зялёная выкарыстоўваюцца для сустрэч сам-насам. Месцам працы Лукашэнкі будынак на Маркса быў яшчэ з пачатку 1990-х — у ім праходзілі пасяджэнні Вярхоўнага Савета, дэпутатам якога быў прагрэсіўны дырэктар саўгаса «Гарадзец». Ужо за прэзідэнцкімі часамі ля «прэзідэнцыі» зладзіў перформанс мастак Алесь Пушкін — вывернуў ля будынка тачку гною.

У цэнтры Мінска ёсць і яшчэ адна «стаўка» кіраўніка выканаўчай улады. Яе адрас — **Вайсковы завулак, 4**. Тут Лукашэнка жыў да свайго перасялення ў Драздзы і нават быў прапісаны. Цяпер у будынку праходзяць пасяджэнні арганізацый Садружнасці незалежных дзяржаў.

Яшчэ адзін маёнтак кіраўніка дзяржавы, назва якога стала ўжо назыўной, — **«Драздзы»**. Ён знаходзіцца на выездзе з Мінска ў бок Маладзечна. Сваю вядомасць пасёлак атрымаў у 1998 годзе, калі з яго, спаслаўшыся на рамонт каналізацыі, гвалтам павыганялі паслоў замежных краін, што мелі там рэзідэнцыі. Лукашэнка жыве тут пастаянна. У суседніх катэджах — самыя ўплывовыя чыноўнікі: прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі, старшыня Нацбанка Пётр Прапаковіч, віцэ-прэм'еры і міністры... Заўсёды пад рукой.



Драздзы на google.map.

«Дальняй дачай» Лукашэнкі лічыцца **«Азёрны»**. Гэтая рэзідэнцыя знаходзіцца ў Астрашыцкім гарадку — непадалёк ад Мінска ў бок Лагойска. За саветамі тут была загарадная рэзідэнцыя маршала Цімашэнкі. На выпадак небяспекі на яе тэрыторыі знаходзіцца бункер, які мусіў вытрымаць нават ядзерны ўдар. Лукашэнка падвысіў абароназдольнасць «Азёрнага», загадаўшы абнесці рэзідэнцыю і сасоннік вакол яе трохметровым плотам з калючым дротам наверсе. За плотам — ахоўныя вышкі з пражэктарамі, а ўздоўж яго ўзараная паласа.

Побач з рэзідэнцыяй знаходзіцца лецішчы творчай эліты краіны — артыстаў, мастакоў і музыкаў.

Летась у Астрашыцкім гарадку аўральна скончалася рэканструкцыя школы. Казалі, што менавіта ў яе будзе хадзіць малодшы сын Лукашэнкі Мікалай, але «першы раз у першы клас» перанеслі на верасень-2010.

Рэзідэнцыя ў **«Віскулях»** не ў пашане ў кіраўніка дзяржавы. Ці то дрэнныя асацыяцыі з развалам СССР, ці то аддаленнасць ад Мінска... Аляксандр Лукашэнка рэдка ўпрыгожвае паляўнічы дамок савецкай партнаменклатуры сваёй прысутнасцю.

Дзве рэзідэнцыі з назвамі **«Заслаўе-1»** і **«Заслаўе-2»** знаходзяцца непадалёк ад Мінскага мора. Яны размешчаныя блізка адна ад адной у сасновым бары. Тут ставіў свой намёт лівійскі лідэр Кадафі падчас візіту ў нашу краіну.

На былое лецішча Пятра Машэрава на тэрыторыі Бярэзінскага гідралагічнага запаведніка цяперашні кіраўнік дзяржавы прыязджае рэдка. Невялікі ўчастак **«Бярэзінскае»** ўключае ў сябе трохпавярховы дом і штучны пляж. У часы незалежнасці вакол рэзідэнцыі быў пабудаваны плот, а таксама з'явіўся кантрольна-прапускны пункт.

Рэзідэнцыя **«Плаўна»** ў тым самым запаведніку — аб'ект, пабудаваны ў часы кіравання Лукашэнкі. Магчыма, тут адпачываў пасля прыезду ў нашу краіну зрынуты прэзідэнт Кыргызстана Курманбек Бакіеў.

Палеская рэзідэнцыя кіраўніка дзяржавы знаходзіцца ў Петрыкаўскім раёне каля аграгарадка **«Ляскавічы»**. Дзякуючы прэстыжнаму суседству, вуліцы населенага пункта замошчаныя тратуарнай пліткай, а дамы абабітыя сайдынгам. Тут здымаўся фільм «На спіне ў чорнага ката», з унучкай Лукашэнкі Вікторыяй у адной з галоўных роляў.

Няўдачай скончылася ідэя Аляксандра Лукашэнкі забраць сабе пад рэзідэнцыю **Нясвіжскі замак**. Пасля гучнага абурэння ЮНЕСКА, якое пагражала спыніць фінансаванне рэканструкцыі замка, кіраўнік дзяржавы быў змушаны адмовіцца ад сваіх планаў.

**Віталь Несцераў**



**Царква Св.Барыса і Глеба** збудаваная ў 1517—1519 на месцы старажытнага храма XII ст. Фундатар — гетман ВКЛ князь Канстанцін Астрожскі. Помнік архітэктуры ўяўляе сабой сімбіёз гатычнага і рэнесанснага стыляў з рысамі абарончага дойлідства. У 1839 царква робіцца праваслаўнай. У 1873—1875 храм перабудавалі ў псеўдарускім стылі, пасля яму вярнулі ранейшы выгляд. Пасля Другой сусветнай вайны царква не функцыянавала, службы аднавіліся ў 1990–я.

# Куды глядзіць міністр Латушка?

**На вежы ўнікальнай гатычнай царквы ў Навагрудку хочуць прысабачыць залатыя купалы ў расійскім стылі.**

Кіраўнік Таварыства аховы помнікаў Антон Астаповіч звярнуўся да навагрудскіх уладаў з патрабаваннем спыніць рэканструкцыю Барысаглебскай царквы — помніка архітэктуры сусветнага значэння. У выніку працаў арганічныя для готыкі шатровыя завяршэнні вежаў плануецца замяніць на пазалочаныя цыбулепадобныя купалы. Гэта скажае аўтэнтычны воблік помніка, піша А.Астаповіч. Спасылаючыся на Ігара Чарняўскага, старшыню ўпраўлення Міністэрства культуры па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, Астаповіч кажа, што рэканструкцыя гэта самавольная, не ўзгодненая з Міністэрствам культуры. Ніводнае праектнае рашэнне яшчэ не было зацверджанае Мінкультам, а мясцовы прыход пазалаціў ужо «цыбуліны» і рыхтуецца іх уссадзіць.



Зміцер Рагачоў

Настаяцель царквы айцец Мікалай Орса абвяргае словы Астаповіча. Паводле яго словаў, праект Міністэрства культуры зацвердзіла.

Навагрудскі бацюшка рабіў спробы надаць царкве расійска-праваслаўны выгляд і раней. Паводле яго меркавання, такім чынам ён аднаўляе гістарычны выгляд, які храм меў ад часоў скасавання уніі да 1991 года. Пра тое, што дазвол ёсць, кажуць і ў райвыканкаме.

«Цыбуліны» на званіцы беларускіх храмаў пачалі ставіць на загад Мураўёва-вешальніка ў XIX стагоддзі, каб замацаваць у ландшафце заваяванага краю «расійскасць».

**Сямён Печанко**

# Пятро Краўчанка: Улёткі Бразаўскаса друкавалі ў Мінску

**26 чэрвеня на 78–ым годзе жыцця памёр былы прэзідэнт Літвы Альгірдас Бразаўскас.**

У перыяд прэзідэнцтва Бразаўскаса Літва пачала шлях у Еўрапейскі Саюз і НАТО. У гэтыя гады з Літвы вывелі Савецкую армію. На другі тэрмін палітык балатавацца адмовіўся. Доўгі час ветэран літоўскай палітыкі змагаўся з ракам.

З Бразаўскасам быў добра знаёмы былы міністр замежных справаў Беларусі Пятро Краўчанка.

«Я пазнаёміўся з Бразаўскасам 20 гадоў таму. Не магу сказаць, што мы цесна сябравалі, але заўсёды былі досыць блізкімі людзьмі. Сёння я смуткую з нагоды ягонай смерці», — кажа П.Краўчанка.

«У асобе Бразаўскаса Літва страціла сапраўднага патрыёта. Мне ўспамінаецца, як аднойчы ў Вільні я стаўся сведкам такой сцэны. У цесным двары хлопцы гулялі ў баскетбол. Адны гулялі за «жоўтых», іншыя — за «зялёных». І толькі адзін хлопчык гуляў «за Бразаўскаса». Калі я спытаўся, чаму, ён адказаў, што гэты чалавек — сапраўдны літовец.

Альгірдас быў вельмі сціплым чалавекам. У 1999 годзе я прыехаў на вакацыі з Японіі. Вырашыў адпачыць у Юрмале. Бразаўскас запрасіў мяне ў госці ў гарадок Ніда, што на Куршскай касе. Дык вось, Бразаўскас нават не меў там лецішча. Ён прымаў мяне ў звычайнай літоўскай кватэры, якая належала ягонай дачцэ. Я запытаўся, чаму ты (часам мы былі на ты) не забяспечыў сваіх тылоў? «А ты забяспечыў свае?» — адказаў ён. На гэта я развёў рукамі.

У нас былі складаныя моманты ў адносінах, калі мы многа спрачаліся. За тэрыторыю паблізу станцыі Гудагай, якую мы ўсё ж згубілі. Бразаўскас не ішоў насустрач у прынцыповых пытаннях. Я прасіў вярнуць Беларусі «Тураўскае Евангелле», але марна.

Цяпер пра гэта ўжо можна казаць, але я адыграў пэўную ролю ў абранні Бразаўскаса першым прэзідэнтам Літвы. Ён тройчы наведваў Мінск інкогніта. Кебіч сустракацца з ім не хацеў, бо лічыў палітычным трупам. А ў нас з Бразаўскасам было шмат супольных сяброў як у Літве, так і ў ЗША.



Значкі з Амерыкі з выявай Бразаўскаса праходзілі праз мяне. Усе ўлёткі кандыдата друкаваліся ў Мінску. А літаральна за тыдзень да выбараў ён папрасіў у мяне дапамогі, як падняць рэйтынг. І я прапанаваў паставіць у Літву трактары «Беларус», якія карыстаюцца попытам у фермераў і сялян. Гэта паказала , што палітык мае добрыя адносіны не толькі з Захадам, але і з Усходам.

Бразаўскас згадзіўся, але Літва не мела грошай аплаціць. Мне ўдалося ўгаварыць Кебіча, і мы паставілі ў Літву 250 трактароў. Дырэктар МТЗ Іван Куляшоў быў супраць, але літоўскі бок разлічыўся з запазычанасцю.

Бразаўскас быў першым з кампартыі, хто пайшоў на мітынгі «Саюдзіса», дзе казаў праўду. Яго там прынялі. У Беларусі асобы ўзроўню Бразаўскаса не знайшлося, хоць ім мог стаць Генадзь Барташэвіч. Такі самы дужы, моцны, як Бразаўскас.

Апошняя наша сустрэча адбылася літаральна некалькі гадоў назад, калі я прывозіў да Альгірдаса свайго сябра, шахматыста Анатоля Карпава. Тады ж я падарыў яму тры ўласныя кнігі.

Бразаўскас нездарма быў ганаровым доктарам ЕГУ. Ён часта сустракаўся з беларусамі, быў у курсе нашых праблем. Хацеў быць пасярэднікам у дыялогу паміж Беларуссю і Літвой».

**Запісаў Зміцер Панкавец**



На замчышчы ладзіліся платныя мерапрыемствы.



Удзельнікі тэатралізаванага шэсця рыхтуюцца да выступу.




Ягайлу і Вітаўта сустракалі нясмелымі воплескамі.



Кіраўнікі Навагрудскага райвыканкама Анатоль Кулак (першы злева ў першым шэрагу) і Гродзенскага аблвыканкама Сямён Шапіра (другі злева) рыхтуюцца да ўрачыстага адкрыцця фестывалю.



Гродзенскі гурт Irdorath працаваў на фэсце за траіх.

# У Навагрудку пагулялі ў Грунвальд

**На пяцізоркавым фэсце сярэднявечнай культуры «Наваградскі замак — 2010» былі і Вітаўт з Ягайлам, і Латушка з Шапірам.**

Пяты па ліку фэст «Наваградскі замак» двойчы пераносіўся: у 2008 і 2009 гадах. Бракавала сродкаў. Таму найпершае — гэта пачуццё радасці, што фэст нарэшце вярнуўся ў Навагрудак. Першы фэст адбыўся дзесяць гадоў таму, у 2000-м, і заяўляецца як штодвухгадовы.

Горад папрыгажэў, на пад'ездах да яго старыя савецкія знакі замянілі на сучасныя, з выявай герба Навагрудка. Пакручастая вуліца Мінская пасля рамонту стала шырэйшай, абапал яе з'явіліся новыя ходнікі і плот.

Незадоўга да фестывалю стала вядома, што адкрываць яго прыедзе прадстаўнічая група чыноўнікаў. Так і было: Наваградак наведалі міністр культуры Павел Латушка, кіраўнік Гродзенскага аблвыканкама Сямён Шапіра, старшыня Гродзенскага аблсавета дэпутатаў Андрэй Навумовіч, пасол у Літве Уладзімір Дражын. Літву на Грунвальдскім фэсце прадстаўляў пасол Эдмінас Багдонас, Польшчу — часовы паверанны Вітальд Юраш. Былі прадстаўнікі міністэрстваў культуры Латвіі і Расіі. Раней адкрыццё фэсту абмяжоўвалася вітальным словам кіраўніцтва раёна.

Такая ўвага да фэсту з боку ўладаў — не адзінае, чым ён розніўся ад папярэдніх. Былі і спрэчныя змены. Свята няўхільна камерцыялізуецца. Як і ў мінулы раз, мерапрыемствы на Замкавай гары зрабілі платнымі. Цэны квіткоў для многіх, найперш мясцовых жыхароў, кусаліся.

Акрамя гэтага, сёлета на галоўнай плошчы горада было вобмаль сярэднявечнай музыкі. Замест выканаўцаў старадаўнасцей і этнікі, на сцэну выходзілі народныя хоры, рок-гурты і аркестр Фінберга. Як вынік, былі моманты, калі на сцэне было больш выканаўцаў, чым слухачоў каля яе. Сітуацыю выратаваў гурт «Палац» ды гродзенцы з Irdorath, чые гарачыя танцы з валынкамі ды бубнам два дні збіралі натоўпы.

Засмуцілі і турнікеты на ўваходах на святочныя пляцоўкі. Працэдура праверкі суровымі людзьмі ў чорнай міліцэйскай форме сама сабою прыніжальная і аніяк не спрыяе святочнай атмасферы. На аналагічных фэстах у Польшчы, Літве, Чэхіі такога не робяць. А Беларусь тут выглядае проста нейкай краінай павышанай тэрарыстычнай небяспекі, што на самой справе не так.

І ўсё ж фэст застаўся фэстам. У горадзе цягам двух дзён можна было пабачыць аўто з усёй краіны. Фінальная масавая бойка ў замкавым рове хоць і была далёка не масавай ды зусім аддалена нагадвала падзеі ў ваколіцах Грунвальда 600-гадовай даўніны, сабрала тысячы гледачоў. Адным з самых кранальных момантаў стала тэатралізаванае шэсце па вуліцах горада сярэднявечных ваяроў у кампаніі караля Ягайлы і князя Вітаўта (ролі іх выконвалі артысты Купалаўскага тэатра – Мікалай Кірычэнка і Андрэй Кавальчук, адпаведна). На падыходзе да плошчы, каля крамы «Дзіцячы свет», натоўп нясмела пачаў апладзіраваць. Хто ведае, можа, акурат так мы, беларусы, вітаючы праз стагоддзі сваіх слаўных продкаў, і пачынаем рабіцца дарослай нацыяй.

## «Палякі ў чэргах стаяць»

Адзін са стваральнікаў фестывалю ў Навагрудку Ігар Міхно патлумачыў, чаму за ўваход на замак сталі браць грошы. «Гэта натуральны працэс развіцця фестывалю. Усё патрабуе выдаткаў, а каб арганізаваць штосьці прыстойнае, трэба вялікія грошы». Пры гэтым сп. Міхно прывёў у прыклад суседнюю Польшчу, дзе, па яго словах, падобныя мерапрыемствы даўно ўжо не бясплатныя. «Там, каб толькі пабачыць на свае вочы тагачасны побыт рыцараў, рамеснікаў і г.д., трэба заплаціць. І палякі плацяць, па сто метраў чэргі стаяць. А ў нас на першых фестывалях усё было за так». Цану квіткоў ён лічыць прымальнай.

Танцы для дзяцей каштавалі 2 тыс. рублёў, спектакль кракаўскага балета — 20, а рыцарскія баі — 10 тыс.

Што да змены музычнага фармату, то тут Ігар Міхно прынцыпова выступае за музыку сярэднявечча. «Раней я асабіста складаў спіс калектываў, найбольш адпавядных духу фэсту, і прапаноўваў яго іншым арганізатарам. Гэтым разам канцэртнай праграмай апекавалася Міністэрства культуры, якое даручыла справу рэжысёру Маладзевага тэатра эстрады Вячаславу Паніну». Сп. Міхно перакананы, што наступным разам фестываль вернецца да ранейшага фармату.

Рэжысёр Вячаслаў Панін, у сваю чаргу, патлумачыў, што ён прывёз у Наваградак акурат гурты, што выконваюць сярэднявечную музыку, а народныя калектывы, мясцовыя рок-гурты і аркестр Фінберга запрашаў райвыканкам. «Так выйшла яшчэ і таму, што на гэтыя выходныя ладзіўся яшчэ адзін фэст у Камянцы і шэраг меншых лакальных мерапрыемстваў. Вось калектывы, што маглі б выканаць «фарматную» музыку, і парасцярушваліся па фэстах. Усе чамусьці вырашылі адзначыць Грунвальд цяпер, а не 15 ліпеня».

## Гэта наш пяцізоркавы фэст

Мастак Алесь Пушкін — сталы ўдзельнік наваградскага фестывалю. Па яго назіраннях, міжнародны фармат мерапрыемства звузіўся, асабліва калі параўноўваць з першым фэстам. Няма ўжо таго першага імпэту ў гасцей ды ўдзельнікаў. Усё хіліцца ў бок камерцыі. Разам з тым, кажа мастак, гэта сведчыць пра рэалістычную ацэнку фэсту яго арганізатарамі і ўдзельнікамі. «Мы ўсе да яго прывыклі і проста прыязджаем сюды адпачыць, пабачыць знаёмых». Сп. Пушкін пахваліў мясцовую ўладу за добрую падрыхтоўку мерапрыемства, адзначыўшы толькі хібы ў арганізацыі намётавага мястэчка для гасцей у Сяльцы ды рыцарскага стану на замчышчы. «Усё ж замак — гэта помнік, таму ладзіць там начлег было няправільна». Мастак пашкадаваў пра адсутнасць на фэсце Валера Зянкевіча з Браслаўскага музея. Затое была батлейка Пана Скіргайлы, якая «прадэманстравала ўзровень, якому варта павучыцца акадэмічным тэатрам».

У любым выпадку, упэўнены Алесь Пушкін, «Наваградскі замак» — гэта наш найлепшы сярэднявечны фэст. Калі яго ацэньваць па пяцізоркавай сістэме, то ён справядліва заслугоўвае ўсе пяць. Бо гэта сталіца ВКЛ і Міндоўг, і проста неперадавальная атмасфера.

## Дажынкі з гістарычным адценнем

Мастак з Наваградчыны Сяргей Емельяновіч не без радасці адзначыў, што на фестывалі стала менш міліцыі. Але і звычайных гасцей таксама — выглядае, што людзі наеліся падобных святаў.

Блогерка ku_palinka ў сваім дзённіку піша: «Мушу сцвердзіць, што фэст заняпаў. На гарадской плошчы спявалі нейкія самадзейныя гурты з псеўданароднымі песнямі і плясками. Замест горада майстроў стаялі палаткі з шашлыкамі, салодкай ватай і папкорнам». Пра камерцыялізацыю свята яна дадае: «Калі ўжо хацелі зарабіць грошы, то маглі зрабіць гістарычныя «атракцыёны»: пастраляць з лука, арбалета, пакатацца на конях, прымерыць і сфатаграфавацца ў сярэднявечным строі і нешта накшталт гэтага. Гэта б надало фэсту атмасферы гістарычнага свята. А так выглядала на Дажынкі з гістарычным адценнем».

## Латушка прыгадаў прарочыя словы

На фестываль у Навагрудку зарэгістраваліся каля чатырохсот удзельнікаў рыцарскіх клубаў з Беларусі, Літвы, Польшчы, Украіны, Чэхіі і Расіі, паведамілі ў аддзеле культуры Навагрудскага райвыканкама. Падрыхтоўка і правядзенне фестывалю абышлася ў 250 мільёнаў рублёў ($80 тыс.), 160 мільёнаў з якіх выдзелілі з бюджэту.

Адкрываючы фэст, Сямён Шапіра адзначыў, што 600 год таму беларусы супольна з суседзямі «надоўга адвучылі крыжакоў рабіць наезды на нашыя землі». Выступаў кіраўнік вобласці па-расійску. Павел Латушка прыгадаў прарочыя словы пра тое, што народ, які не памятае сваёй гісторыі, не мае будучыні. Міністр падкрэсліў, што беларусы памятаюць усе свае перамогі: і 600-гадовай даўніны, і 65-гадовай.

**Сямён Печанко, Навагрудак—Мінск**

# Сталінград XVII стагоддзя

**28 чэрвеня споўнілася 350 гадоў з дня бітвы пад Палонкай. Яна павярнула гісторыю нашай часткі Еўропы. Тут, на палях каля сучасных Баранавіч, маскоўскі цар Аляксей Міхайлавіч развітаўся з марай выйсці да Балтыкі. З–пад Палонкі пачалося і вызваленне Беларусі ад маскоўскай акупацыі. Гэта быў пералом у самай крывавай у гісторыі Беларусі «Невядомай вайне» 1654—1667 гадоў, якая забрала жыцці паловы насельніцтва краіны.**

Трынаццаць гадоў варожыя войскі вынішчалі наш край. У выніку Беларусь страціла больш за палову свайго насельніцтва. Некаторыя ўсходнія землі цалкам абязлюдзелі. Сотні тысяч жыхароў, асабліва майстроў і рамеснікаў, былі выведзены палонам на ўсход. Само існаванне дзяржавы ўстала пад пытанне. Расейскі цар Аляксей Міхайлавіч намерваўся заваяваць яго цалкам. У самым пачатку вайны, пасля захопу Смаленшчыны, ён нават дадаў да свайго тытула згадку, што ўжо з'яўляецца гасударом і «Белыя Русі». На нашае Падняпроўе прэтэндавала і Украіна Багдана Хмяльніцкага.

«Вокруг Слуцка велели мы всё выжечь, а идучи дорогою до Слонима села и деревни, и хлеб, и сено по обе стороны жгли и людей побивали и разоряли совсем без остатку, а в Клецке в городе людей побили всех», — падобнымі рэляцыямі маскоўскіх ваяводаў была запоўнена тагачасная царская канцылярыя.

Да канца 1655 года практычна ўся Беларусь была акупавана маскоўцамі. Вольнымі заставаліся толькі Берасце ды яшчэ некалькі асабліва ўмацаваных гарадоў. Сярод іх — Стары Быхаў, які далёка ў тыле ворага мужна трымаў абарону цэлых 18 месяцаў.

Да ўсіх няшчасцяў дадаўся і «шведскі патоп», калі войскі Карла Густава летам 1655 года пераплылі Балтыку і высадзіліся на ўзбярэжжы Рэчы Паспалітай. Праз некалькі месяцаў яны захапілі Польшчу, Жамойць і Інфлянты. Пяхотнікі шведскага караля выйшлі нават на поўнач Беларусі, падступілі да захопленай маскоўцамі Вільні.

Узімку 1658—1659 гадоў маскоўскі цар зноў узмацніў націск на не заваяваныя яшчэ абшары Беларусі. Над войскам быў пастаўлены вопытны ваявода Іван Хаванскі. Захапіўшы Горадню, ваявода спустошыў абшары Падляшша, а потым павярнуў на апошні вольны куток Беларусі — Берасцейшчыну. 15 студзеня 1659 года быў здабыты штурмам замак самога Берасця, а горад «да найменшага будынка... разбураны, спалены і ў нішто ператвораны».

20 сакавіка 1660 года 30-тысячная маскоўская раць падышла да Ляхавіцкага замка. Амаль адразу ж ворагі пачалі абстрэльваць і штурмаваць фартэцу. Але чатырохтысячны гарнізон на чале з камендантам Станіславам Юдзіцкім, маючы моцную артылерыю, мужна бараніўся і наносіў вялікія страты праціўніку. Ды ваявода Хаванскі любым коштам імкнуўся захапіць Ляхавічы як адну з апошніх цытадэляў беларускага супраціву.

У маі 1660 года, пасля шэрагу перамог над Карлам Густавам, паміж Варшавай і Стакгольмам быў нарэшце падпісаны мірны трактат. І цяпер Польшча магла вылучыць частку сілаў для дапамогі скрываўленаму Вялікаму Княству. На Берасцейшчыну, дзе змагалася войска гетмана Паўла Сапегі (каля 8 тысяч ваяроў), быў накіраваны ўкраінскі ваявода Стэфан Чарнецкі з 4-тысячнай дывізіяй.

Аб'яднаныя беларуска-польскія сілы адразу ж пачалі актыўныя дзеянні супраць захопнікаў.

Спачатку быў выбіты маскоўскі гарнізон са Слоніма. Знішчаны аддзелы акупантаў пад Зэльвай, Галынкай і Дзярэчынам. Павел Сапега з-пад Жыровічаў паслаў некалькі загонаў у кірунку Ляхавічаў. Ён хацеў адцягнуць на сябе хоць частку аблажнікаў замка. Першая сустрэча з раз'ездам (пошукавым аддзелам) праціўніка закончылася паразай расейцаў. Ацалелыя рэшткі ўцяклі ў свой лагер пад Ляхавічамі. І тут царскі ваявода выступіў насустрач нашым войскам.

З вечара 27 чэрвеня дывізіі Сапегі (каля 6 тысяч) і Чарнецкага (4 тысячы) сталі ў баявыя шыхты. Цэнтр заняло войска Чарнецкага. На крылах пазіцыі размясціліся сапегаўцы: на правым — жаўнеры пад камандай Вайніловіча, на левым — на чале з Палубінскім. Маскоўскі ж ваявода ў цэнтры свайго войска паставіў пяхотнікаў і вершнікаў-райтараў, на левым крыле — конніцу князя Шчарбатага, а вершнікаў правага крыла ўзначаліў сам.

А 8-й гадзіне раніцы наступнага дня Хаванскі, які меў войска больш як 20 тысяч чалавек, распачаў бітву. Першай пайшла ў атаку конніца той беларускай шляхты, якая ваявала на баку маскоўскага цара. У часе пераправы цераз балоцістую рэчку Палонку яна трапіла пад моцны агонь рушніц, а затым была разбітая контратакай ваяроў Чарнецкага. Сам правадыр шляхты трапіў у палон. На дапамогу маскоўцы паслалі 6 тысяч пяхотнікаў. Ды на пераправе цераз тую ж рэчку яны былі заатакаваныя беларускімі і польскімі гусарамі. Вершнікі ў вадзе і на прыбярэжжы секлі ратнікаў Хаванскага. Пад агнём маскоўскай артылерыі пайшло



**Стэфан Чарнецкі.**

ў наступ левае крыло беларускага войска. Грузнучы ў балоце, коштам вялікіх стратаў гусары Палубінскага прарваліся на сухазем'е. Вымкнуліся наперад таксама войскі цэнтра і правага крыла.

Хаванскі кінуў на дапамогу ратнікам рэшту сваіх сілаў — найлепшыя баярскія палкі і нямецкіх райтараў. Пакінуўшы ўжо за спінай нялёгкую пераправу, нашы войскі мелі толькі выбар: перамагчы або памерці. Жаўнерам трэба было вытрымаць і пераламаць ход змагання. І яны выстаялі.

Вось ужо маскоўскі ваявода паранены шабляй у галаву. Харугвы Вайніловіча зайшлі збоку і імкліва ўдарылі ў фланг, потым зайшлі з тылу. Пры атацы яны натрапілі на маскоўскую пяхоту з артылерыяй, што замацавалася ў фальварку. Удзельнік бітвы пад Палонкай пазней успамінаў гэты момант: «Позна было агонь даваць, калі ляцеў град куль. Палеглі забітымі шмат жаўнераў, шмат атрымалі раненні. Але яшчэ з большым імпэтам пайшлі мы на іх, бо ўбачылі, што ледзь не ўсе загінем, калі спіны пакажам (гэта значыць, калі кінуцца ўцякаць). І безвач лезлі ў агонь, ды так з імі змяшаліся». Выбітых з такой цяжкасцю з фальварка маскоўскіх пяхотнікаў высекла ў чыстым полі конніца. «Цяжка было раз'юшаным жаўнерам звязаць рукі, і выбілі яны тры тысячы да аднаго», — быццам апраўдваючыся, пісаў потым Павел Сапега.

Трапіў у палон Шчарбаты, загінуў другі маскоўскі ваявода — Змееў.

З дзвюма шабельнымі ранамі галавы сам Хаванскі панічна пабег пад Ляхавічы. Ён хацеў прыхапіць рэшту ацалелага войска і пад яго аслонай уратавацца. Наступнай ноччу ён быў ужо ў Менску. Адтуль памкнуў далей на ўсход. Дыханне перавёў толькі ў Смаленску.

У кінутым лагеры пад Ляхавічамі пераможцам дасталіся вялізныя трафеі. Асабліва радаваўся Павел Сапега шматлікай артылерыі, запасам пораху. Было тут таксама багата









перамяшчэнні аб'яднаных беларуска-польскіх войскаў
месца бітвы
землі, захопленыя маскоўцамі
землі, захопленыя шведамі

мукі і больш як сем тысяч нарабаваных у сялян кароў.

Паводле сведчання Шчарбатага, пад Палонкай загінула 16 тысяч маскоўцаў. Ад Палонкі пачалося выгнанне захопнікаў з нашай зямлі. У тылах з новай сілай разгарнулася народная партызанская барацьба. Неўзабаве войскі Сапегі і Чарнецкага былі ўжо пад Барысавам. Некаторыя загоны падышлі ажно да Смаленска. Яшчэ некалькі гадоў працягваліся паходы і бітвы. Пошугі ваеннай актыўнасці чаргаваліся з мірнымі перамовамі.

І нарэшце на самым пачатку 1667 года ў вёсцы Андросаве пад Смаленскам паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай было падпісанае замірэнне. ВКЛ выстаяла.

**Паводле: Міхась Чарняўскі, кніга «Дзесяць бітваў»**

# Касьба пад Палонкай

28 чэрвеня, у 350-ю гадавіну бітвы пад Палонкай, на яе месцы прайшла святочная імпрэза. Спачатку ўдзельнікі прыбралі тэрыторыю ад смецця і скасілі траву ля памятнага каменя-валуна. Затым краязнаўцы Віктар Сырыца і Міхась Бернат расказалі пра гісторыю бітвы, баранавіцкія паэты Алесь Корнеў, Янка Збажына і Іван Лагіновіч прачыталі вершы, прысвечаныя нашым ваярам. Вялікае ўражанне на прысутных зрабіў выступ рыцарскага клуба «Шляхецкая застава».

На заканчэнні мерапрыемства патрыятычныя песні спявалі Галіна Ярашэвіч і Алесь Грыцавец, а саксафаніст Валер Шыла падараваў прысутным чароўныя гукі паланэза «Развітанне з радзімай» Міхала Клеафаса Агінскага.

Баранавіцкая грамадскасць некалькі разоў усталёўвала на месцы бітвы памятны знак. Раённае кіраўніцтва падымала лямант. Маўляў, прыведзяце да таго, што Расея адмовіцца пастаўляць Беларусі нафту і газ. Помнік, асвечаны царквою і касцёлам, руйнавалі ўначы «невядомыя».

У царскі і савецкі час катэгарычна забаранялася гаварыць і пісаць пра перамогі над маскоўскім царом. Сёння, дзякуй Богу, наша дзяржава пазбаўляецца плебейства і комплексаў «малодшага брата» не толькі ў сацыяльна-эканамічнай, палітычнай сферах, але і ў адзнаках сваіх гістарычных падзей.

**Віктар Сырыца, старшыня Баранавіцкай Рады ТБМ**



**Сучасныя касінеры шануюць памяць продкаў.**

# «Тугеза» вычынкі ці вартая?

**Фестываль Be2Gether на беларуска–літоўскім памежжы прайшоў пры большым удзеле айчынных выступоўцаў, але нізкай цікавасці айчынных гледачоў.**

Разам з палітычным разваротам Беларусі ў бок Еўропы змянілася атмасфера музычнага фэсту Be2Gether, што прайшоў у памежных Нарвілішках 26—27 чэрвеня. Фэст разам наведалі паслы Беларусі ў Літве Уладзімір Дражын і Літвы ў Беларусі Эдмінас Багдонас.

Легалізацыя адчувалася ад самай мытні. «Едзьце ўжо, едзьце, а то сапраўды правяраць будзем», — жартавалі беларускія мытнікі. І моладзь кіравалася на фестываль, прыгаломшаная павярхоўнасцю праверкі.

Яшчэ навіна сёлетняга фэсту — з'яўленне беларускіх буданоў-павільёнаў. На Be2Gether іх было ажно тры. Праўда — з пяцідзесяці наяўных. Але раней і таго не было.

Галерэя сучаснага мастацтва «Ў» забаўляла ў сваю павець выступамі ды-джэяў і асацыятыўнымі маечкамі «За Беларусь!». На імправізаваным подыуме з драўляных скрыняў выступалі паэты Віталь Рыжкоў, Марыя Мартысевіч і Алеся Башарымава. Літоўскія гледачы разгарачыліся і вырашылі, што тут ідзе імправізаванае спаборніцтва рэчытатываў. Распіхваючы паэтаў, гледачы палезлі на сцэну з уласнымі рэп-імправізацыямі.

Грамадская кампанія за пашырэнне беларушчыны масам «Будзьма беларусамі!» у сваім будане паказвала знову жа ды-джэяў, белачырвоныя сакол кі з надпісам «Я ёсць» і маечкі з беларусізаваным сабакам Валетам (аўтарства Лявона Вольскага). Літоўцаў тут таўклося найбольш. «Бульба» і «Лукашэнка» — гэтыя словы тут гучалі найчасцей.

Разынкаю намёта быў бодзі-арт. «Вас тут на фестывалі стала больш, — казала літоўская дзяўчына Аніта, якой мастак Алесь Таболіч наносіў малюнак на грудку. — Ну, што сказаць пра беларусаў? Ніякіх прэтэнзіяў да людзей, толькі станоўчыя эмоцыі, але, паміж намі, як можна спакойна трываць Лукашэнку?»

Бліжэй да народу стаяў невялікі намёт грамадскага руху «Гавары праўду». Праўдагаварыльцы раздавалі дажджавікі з сімволікай кампаніі. У адрозненне ад «Будзьмы», якая свае майкі прадавала па 15 літаў.

Фактычна чацвёртым беларускім павільёнам зрабілася сельпо ў бліжэйшай вёсцы Нарвілішкі. У вёсцы, населенай беларусамі, магазін заклічна гарэў дадатковай ілюмінацыяй і прадаваў піва ў два разы танней, чым на фэсце.

З найбольш чаканых гуртоў былі ўкраінскія «Гайдамакі» — у шараварах, з асэлядцамі і электрагітарамі. Яны завялі публіку з паўабарота і давялі, што нездарма ўжо столькі гадоў прафесійна працуюць жывой іконай украіншчыны. А на галоўную страву была спявачка Скін — як і «Гайдамакі», з паголенай галавой. Яе гурт Scunk Anansie давёў публіку да экстазу і ўжо на другой песні парваў бубен.

Нават пад аўстралійскую фрык-дыскатэку Empire of the Sun адрывалася блізу тысячы беларусаў і літоўцаў. Хэдлайнер беларускай праграмы Лявон Вольскі сабраў каля 200 чалавек з тых, што вандравалі між трыма сцэнамі фестывалю. Іншыя ўдзельнікі ад нашай краіны, гурты Open Space, Akute, Cherryvata, не маглі пахваліцца і такой колькасцю.

У атмасферы лучнасці душаў на заходзе сонца тыя дзвесце праслухалі праграму «Белая яблыня грому» і новыя з кампазіцыі «Крамбамбулі». Пасля канцэрта Лявон нейкі час быў даступны ў раале для сумесных фота.

Айчынныя гурты прыцягнулі амаль выключна айчынных слухачоў. А іх было не так і многа. Мо справа ў тым, што за 185 тысяч рублёў можна было не толькі набыць квіток на фэст, але і аўтаматычна атрымаць літоўскую візу? І шмат хто выкарыстаў гэтую нагоду, каб праехацца на Балтыйскае мора або ў Вільню. Але наколькі тады апраўданыя гіганцкія ўкладанні ў фэст, задуманы дзеля «яднання праз музыку»?

**Алесь Пілецкі, Павал Касцюкевіч**




ЮЛІЯ АЛЯКСАНДРАВА



АЛЯКСАНДР (TARANTINO) ЖДАНОВІЧ, BUDZMA.ORG

**Хэдлайнерам фэсту быў украінскі гурт «Гайдамакі».**



ЮЛІЯ АЛЯКСАНДРАВА

**Паслы Дражын (у цэнтры) і Багдонас (справа) таксама наведалі фестываль. Іх сустракаў арганізатар фэсту: бізнэсовец-уласнік палаца ў Нарвілішках.**

### Лідэр Empire Of The Sun — беларус

Пра гэта Люк Стыл, фронтмен эпатажнага аўстралійскага гурта, расказаў газеце Lietuvos Rytas. «Мая бабуля беларуска, — адзначыў ён. — Падчас Другой сусветнай вайны яна эмігравала ў Аўстралію. Я ніколі яшчэ не быў так блізка да яе радзімы».

**Naviny.by**



АЛЯКСАНДР (TARANTINO) ЖДАНОВІЧ, BUDZMA.ORG

# Лявон Вольскі: Я бачу прагрэс

**Рок–музыка лічыць, што беларускія гурты проста паставілі выступаць не ў тое месца і не ў той час.**

**«Наша Ніва»: Сёлета ваш выступ на Be2gether сабраў дзве сотні чалавек. Чаму так мала?**

**Лявон Вольскі:** Я лічу, што так і мае быць. Раней на гэтым фэсце было горш, чым сёлета. Упершыню паўсталі беларускія павільёны. Пры іх ладзіліся нейкія мерапрыемствы, дыскатэкі. Гэта ўсё вельмі станоўча можна ацаніць. Гэта крок наперад.

**«НН»: Якім чынам можна сябе папулярызаваць? Павялічыць беларускую прысутнасць на тым жа Be2gether?**

**ЛВ:** Трэба пераконваць арганізатараў у тым, што беларусы таксама вартыя быць хэдлайнерамі і выступаць у той самы час і на той самай сцэне, як сёлета ўкраінскія «Гайдамакі». Трэба высылаць арганізатарам якасны матэрыял, каб яны бачылі, на што мы здатныя. Няма нічога страшнага ў тым, што беларускі гурт сабраў сотню гледачоў. Трэба паступова працаваць над тым, каб іх было больш.

Я бачу прагрэс. Сёлета ў Нарвілішкі не даехала страўня «Каменіца». Магчыма, яны будуць на наступным фэсце, з беларускай кухняй. Іншыя цікавыя рэчы можна дэманстраваць. Такі фэст — гэта насамрэч добры спосаб паказаць сябе. Варта гэтым актыўна карыстацца.

**Алесь Пілецкі**

# Жалеза не скончылася

**З дэталяў трактара «Беларус» ён рабіў фігуры жывёл. Са старых верацёнаў — творы мастацтва. Пасмяротная выстава Андрэя Капуснікава.**

У мінскай галерэі сучаснага мастацтва «Ў» (Незалежнасці, 37а) адчынілася выстава-ўспамін «Жалеза скончылася». Тут сабраныя невядомыя працы адметнага скульптара Андрэя Капуснікава.

Капуснікаў найбольш працаваў у рэдкай форме металапластыкі. З парэштак трактара «Беларус» — фігуры жывёл, іржавыя кветкі — з гаек і дыскаў. Капуснікаў ствараў свой мастацкі свет з пабочных прадуктаў грамадства спажывання. Матэрыялы для сваіх прац ён не купляў у крамах, а шукаў на гарышчах і звалках. Аднак у экспазіцыю дадзенай выставы ўвайшлі аб'екты не з металу, а з дрэва, серыі аўтарскіх фотаздымкаў. Эпоха жалеза скончылася?

«На выставе мы хочам паказаць усебаковасць таленту Андрэя Капуснікава, яго накіды і працы з цёплага і прыязнага матэрыялу — дрэва, — кажа арт-дырэктарка галерэі «Ў» Ганна Чыстасердава. — Падчас сваіх вандровак па Беларусі ён збіраў верацёны, старыя колы, каб даць ім новае жыццё ў сваіх творах».

Выстава «Жалеза скончылася» адкрывае невядомага Капуснікава многім, хто меркаваў, што добра ведае «жалезнага майстра».

Акрамя драўляных выяваў і інсталяцый, на выставе прадстаўленыя відэасюжэты з персанальнага архіва, сярод якіх аповед пра супрацу Капуснікава з рыцарскімі клубамі. Выстава «Жалеза скончылася» працягнецца да 5 ліпеня.

**ЛК**

**Андрэй Капуснікаў**

Нар. у 1963 у Чаркеску (Расія). У 1970 пераехаў у Мінск. Пасля заканчэння медвучэльні 12 год працаваў зубным тэхнікам. Металапластыкай пачаў займацца ў 1990–я. У 2006 адбылася яго першая персанальная выстава «Б/У. Флора і фауна». У 2009 — вялікая выстава ў галерэі «Падземка» — «Персанальная іржа». Працы Капуснікава знаходзяцца ў Беларусі (у прыватнасці, у калекцыі Мастацкага музея), у прыватных зборах у Літве, Нямеччыне, Англіі, Даніі.

## Сцісла

• **«Ноч паядальнікаў рэкламы» — штотыдзень.** Праект «Ноч паядальнікаў рэкламы» палюбіўся публіцы ва ўсім свеце. Сёлета спаўняецца 30 гадоў з дня першай дэманстрацыі ў Парыжы ролікаў са знакамітай калекцыі француза Жана Мары Бурсіко. З 2000 года паказы арганізуюцца і ў Мінску. Аднак калі раней яны праходзілі нячаста, то ўжо хутка падборкі маленькіх рэкламных шэдэўраў можна будзе глядзець кожны тыдзень. «Ноч пажыральнікаў рэкламы» атрымае прапіску ў новым арт-кінатэатры Rubin Plaza, які адкрыецца сёлета ў аднайменным гандлёва-забаўляльным цэнтры ў Мінску. Першы ў беларускай сталіцы прыватны арт-кінатэатр будзе складацца з двух лічбавых залаў: на 94 і 54 месцы. У адной будуць дэманстравацца найноўшыя сусветныя прэм'еры ў суперпапулярным фармаце 3D. Іншая зала кінатэатра будзе арыентаваная на арт-хаус і тэматычныя праграмы. Будзе ў Rubin Plaza і кінабар з папкорнам і цукровай ватай. Цукеркі ж у шалёстkіх абгортках трэба будзе прыносіць з сабой.

• **На сцяне аднаго з віцебскіх дамоў з'явіўся павялічаны эскіз работы Малевіча.** У мінулыя выхадныя ў Віцебску прайшла арт-акцыя «Вуліца УНОВІСа»: на сцяне дома, што размяшчаецца на рагу вуліц Леніна і Праўды, з'явіўся павялічаны эскіз работы Казіміра Малевіча, створаны ім у 1919 годзе.

**СМ**

# Аліса ў Залюстроўі

Піша **Віктар Малішэўскі**.
Алегорыя.

— Ану, зірні на дарогу! Каго ты там бачыш? Ці не з'явіліся там першыя годныя кандыдаты? Гавары праўду!

— Нікога, — сказала Аліса.

— Мне б такі зрок! — заўважыў Кароль з зайздрасцю. — Убачыць Нікога! Ды яшчэ на такой адлегласці! Я за ўсе гэтыя гады і сапраўдных людзей з цяжкасцю адрозніваю!

Аліса яго не слухала: яна не адрываючыся глядзела на сайт Хартыі.

— Там хтосьці ідзе! — сказала яна нарэшце. — Толькі вельмі марудна. І неяк дзіўна.

— А-а! — сказаў Кароль. — Гэта мой заходні Ганец са сваімі ўсходнепартнёрскімі позамі. Ён заўсёды так, калі расчараваны. А завуць яго Еўра Нэст. А другога майго ганца завуць Перамоў Шчык, — дадаў Кароль. — У мяне іх два — адзін бяжыць туды, а другі — адтуль.

— Прашу вас... — пачала Аліса.

— Не канькай, — сказаў Кароль строга. — Льготы скасаваныя два гады таму. Прыстойныя людзі ў нашай краіне нічога не просяць!

— Я проста хацела сказаць: «Прашу вас, растлумачце мне гэта, калі ласка». Як так: адзін бяжыць туды, а другі адтуль? Я не разумею...

— Але ж я табе кажу: у мяне іх два! — адказваў Кароль нецярпліва. — Адзін жыве, другі — хлеб з нафтай жуе.



Квентын Масэйс. «Паскудная герцагіня» (1530).

У гэты момант да іх падбег Ганец: ён так задыхаўся, што не мог вымавіць ні слова — толькі махаў рукамі і крывіў беднаму Каралю грымасы, паказваючы скасаванне смяротнага пакарання.

— Каго ты сустрэў па дарозе? — спытаў Кароль ганца, цягнучы руку за другой порцыяй крэдыту.

— Нікога, — адказваў Ганец.

— Чуў-чуў, — сказаў Кароль. — Гэтая асоба таксама яго бачыла. Ён, значыць, не так хутка бегае. Што ж, ты ўжо аддыхаўся, а ну скажы, што чуваць у краіне? Гавары праўду!

— Лепш я шапну вам на вуха, — сказаў Ганец і нагнуўся да Караля. Аліса засмуцілася — ёй таксама хацелася ведаць, што адбываецца ў краіне, усё-ткі выбары. Але Ганец трыумфальна гаркнуў Каралю проста ў вуха:

— Яны зноў узяліся за сваё!

— Гэта, па-твойму, шэпт? — закрычаў бедны Кароль, падскокваючы на месцы і скаланаючыся.

— Хто ўзяўся за сваё? — спытала Аліса.

— Як — хто? АдзіныРог і ЕўраЛеў, вядома, — адказваў Кароль.

— Смяротны бой за карону? — спытала Аліса.

— Ну, вядома, — сказаў Кароль. — Смяшнейшае за ўсё тое, што яны б'юцца за маю карону! Пабяжым, паглядзім? І яны пабеглі.

— Хто... пераможа... атрымае... карону? — спытала Аліса, цяжка дыхаючы.

— Ну, не! — сказаў Кароль. — Што гэта табе ў галаву прыйшло?

Яны беглі, пакуль не ўбачылі нарэшце вялізны натоўп донараў, што атачыў ЕўраЛьва і АдзінагаРога, якія біліся так, што пыл у вочы гледачам стаяў слупам... Аліса ніяк не магла разабраць, хто з іх хто. Гледачы таксама.

Тут бой спыніўся, і ЕўраЛеў з АдзінымРогам паселі, цяжка дыхаючы.

— Перапынак — 10 хвілін! — закрычаў Кароль. — Усім падсілкавацца!

Міма, засунуўшы рукі ў кішэні, пракрочыў АдзіныРог.

— Сёння я ўзяў верх, — кінуў ён звысоку, ледзь зірнуўшы на Караля.

— Злёгку, — нервова адказаў Кароль. — Толькі навошта вы праткнулі яго наскрозь абвінавачаннем у сувязях з Крамлём?

— Балюча яму не было, — сказаў АдзіныРог спакойна. І пайшоў быў міма. Але тут погляд яго ўпаў на Алісу. Ён рэзка павярнуўся і пачаў разглядаць яе з найглыбейшай агідай.

— Гэта... што... такое? — спытаў ён нарэшце.

— Гэта электарат, выбаршчык, — з гатоўнасцю адказаў Ганец Еўра Нэст. Ён падышоў да Алісы і, прадстаўляючы яе, шырока павёў абедзвюма рукамі, прыняўшы адну з усходнееўрапейскіх прымірэнчых позаў. — Мы толькі сёння яе знайшлі! Гэта самы сапраўдны, жывы выбаршчык — жывей няма куды! Не са Страсбурга, родны, айчынны.

— А я заўсёды быў упэўнены, што электарат — проста казачныя пачвары, — заўважыў АдзіныРог. — Як ты сказаў? Яна жывая?

— Яна гаворыць, — урачыста адказаў Ганец Еўра Нэст. — Магчыма, думаючая істота.

АдзіныРог задуменна паглядзеў на Алісу і прагаварыў:

— Кажы, электарат!

Губы ў Алісы зварухнуліся ва ўсмешцы, і яна сказала:

— А ведаеце, я заўсёды была ўпэўненая, што АдзіныяРогі — проста казачныя пачвары! Я ніколі не бачыла апазіцыю зблізку, толькі па тэлевізары.

— Што ж, цяпер, калі мы ўбачылі адно аднаго, — сказаў АдзіныРог, — можам дамовіцца: калі ты будзеш верыць у мяне, я буду верыць у цябе! Добра?

— Добра, калі вы так жадаеце, — адказала Аліса.

У гэты час да іх падышоў ЕўраЛеў — выгляд у яго быў стомлены і снулы, вочы раз-пораз закрываліся, ён быў стары.

— А гэта што такое? — спытаў ён, міргаючы, голасам глухім і глыбокім, нібы звон.

— Паспрабуй, адгадай! — усклікнуў радасна АдзіныРог. — Нізашто не адгадаеш! Я і то не змог! Спрачаемся на сацыял-дэмакратаў!

Леў стомлена паглядзеў на Алісу.

— Ты хто? — спытаў ён, пазяхаючы пасля кожнага слова. — Назіральнік, так? Актывіст БРСМ? Ці з дыпкорпуса АБСЕ?..

Не паспела Аліса і рот раскрыць, як АдзіныРог закрычаў:

— Гэта казачная пачвара — вось гэта хто!

— Што ж, выбірай вартага сярод нас, Пачвара, — сказаў Леў і ўлёгся на траву, паклаўшы падбароддзе на лапы.

Аліса, паклаўшы выбарчы бюлетэнь сабе на калені, старанна вадзіла па паперы шарыкавай асадкай.

— Нічога не разумею! — сказала яна ЕўраЛьву (яна ўжо амаль прывыкла да таго, што яе завуць Пачварай). — Я ўжо прагаласавала некалькі разоў, а ўсе мае «птушачкі» зноў сціраюцца!

— Ты не ўмееш абыходзіцца з Залюстроўнымі бюлетэнямі, — заўважыў АдзіныРог. — Спачатку кідай яго ў выбарчую скрыню, а ўжо потым стаў сваю «птушачку» за вартага!

Вядома, гэта было бессэнсоўна, але Аліса так і зрабіла.

— Гэта несумленна! — закрычаў раптам АдзіныРог (Аліса ў разгубленасці глядзела на запоўненую даверху скрыню). — Пачвара дала ЕўраЛьву ўдвая больш, чым мне!

— Затое сабе яно нічога не ўзяло, — сказаў ЕўраЛеў. — Ты любіш выбары, Пачвара?

**Публікуецца паводле malishevsky.livejournal.com**



Народныя навіны Віцебска

**У чацвер 24 чэрвеня ў Віцебску, у касцёле св. Барбары, адбылося высвячэнне ў святары брата-дамініканца Пётры Рудкоўскага. Пётра Рудкоўскі нарадзіўся ў Канвелішках Воранаўскага раёна. Ад маладосці выбраў сабе духоўную сцежку. Быў манахам, цяпер абраў святарства. Брат — а цяпер ужо айцец Пётра — вядомы таксама як інтэлектуал. Ён вядзе блог на сайце «НН». Цырымонію правёў біскуп Уладзіслаў Блін. У часе цырымоніі будучы святар ляжыць плазам перад алтаром. На лаве — тата, мама і іншыя сваякі святара.**



## АЛЕГ МІНКІН

ПАКАЕЎКА

Ніхто ўжо ноччу не шапоча:
Ты — недасяжнае красы...
У развітальныя часы
Ніхто ўжо не цалуе ў вочы.

Не Афрадыціна галоўка
Шчакою на тваім плячы,
А злая Бессань-пакаеўка
Сярдзіта тупае ўначы.

**Алег Мінкін**
паэт-неакласік, жыве ў Вільні. Нар. 31 сакавіка 1952 у в. Чарняўка Хоцімскага раёна. Гадаваўся ў Бабруйскім інтэрнаце. Працаваў электрамантажнікам, брыгадзірам, інжынерам-электрыкам у разнастайных мясцовасцях былога СССР: Бурацiя, Беларусь, Літва, Латвія, Валагодская, Бранская, Арлоўская, Пскоўская вобласці, Ханты-Мансійская акруга. Даўжэй жыў у Брэсце, ад 1991 па сёння — у Вільні. Там рэдагаваў газету беларусаў Літвы «Рунь». Стварыў (нявыдадзены) слоўнік беларускіх рыфмаў. Аўтар зборнікаў паэзіі «Сурма» (1985), «Расколіна» (1991) і «Пенаты» (2007). Аўтар кнігі прозы «Праўдзівая гісторыя Краіны Хлудаў» (1994). Шмат перакладае. Лаўрэат прэміі «Гліняны Вялес». Мае ўнікальны неакласічны паэтычны голас.

# Вы думаеце, выхаванне штосьці значыць?



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Для здароўя ці жыццёвага шляху вашых дзяцей — нічога. Але любоў бацькоўская не забываецца. Новыя даследаванні генетыкі паводзінаў.**

Цяжка размежаваць прыроду і выхаванне. Каб гэта зрабіць, даследчыкі, якія называюцца генетыкамі паводзінаў, вывучалі два тыпы сем'яў: з блізнятамі і прыёмнымі дзецьмі. Калі паміж аднаяйкавымі блізнятамі існуе нашмат мацнейшае падабенства, чым паміж двух'яйкавымі, прычына крыецца ў прыродзе. Калі прыёмныя дзеці дэманструюць падабенства з прыёмнымі бацькамі, справа, відавочна, у выхаванні.

Бацькі імкнуцца прышчапіць дзецям здаровыя звычкі. Але два найлепшыя даследаванні па генетыцы паводзінаў, якія вывучалі працягласць жыцця — адно з 6000 дацкіх блізнятаў, якія нарадзіліся паміж 1870 і 1900, другое з 9000 шведскіх блізнятаў, народжаных між 1886 і 1925, — паказалі нулявы эфект выхавання.

Вывучэнне росту, вагі і нават зубоў блізнятаў прыводзіць да такіх высноваў. Гэта не значыць, што дыета, фізічныя практыкаванні і чыстка зубоў ні на што не ўплываюць, што патрабаванні правільна харчавацца, займацца гімнастыкай і чысціць зубы пасля ежы не змогуць знайсці дарогу да дзіцячага сэрца і розуму.

Бацькі таксама імкнуцца зрабіць са сваіх дзяцей разумных і шчаслівых дарослых, але генетыкі паводзінаў не знаходзяць доказаў таго, што іх намаганні даюць эфект.

Вывучэнне сотняў блізнятаў, якія выхоўваліся асобна, паказала, што аднаяйкавыя блізняты выяўляюць нашмат больш падабенства ў разумовых здольнасцях і эмацыйнасці, чым разнаяйкавыя, але блізняты, што выхоўваліся разам, толькі крыху больш падобныя адно да аднаго, чым тыя, хто выхоўваўся асобна.

Блізняты, якія выхоўваліся асобна, з пункту гледжання жыццярадаснасці былі больш падобныя, чым тыя, хто выхоўваўся разам.

Магчыма, гадаванне разам прымушае людзей дыферэнцыявацца, то бок «калі ён шчаслівы, то я буду незадаволены».

Генетыкі паводзінаў таксама лічаць, што ўплыў выхавання на маральнасць даволі адносны.

Бацькі маюць моцны ўплыў на тое, да якой веры яны будуць сябе адносіць і якіх палітычных поглядаў трымацца, але вельмі малы ўплыў на іх дарослыя паводзіны.

Некаторыя даследчыкі блізнятаў і прыёмных дзяцей лічаць, што бацькі не вельмі ўплываюць на курэнне сваіх дзяцей, ужыванне імі алкаголю і наркотыкаў, злачыннасць сярод непаўналетніх і на тое, калі дочкі (але не сыны) пачынаюць займацца сэксам. Бацькі часта змяняюць сваіх дзяцей у кароткатэрміновай перспектыве, але па меры росту дзяцей уплыў бацькоў змяншаецца.

**Уплыў выхавання на маральнасць вельмі адносны.**

Карацей, калі вы думаеце, што будучыня вашых дзяцей у вашых руках, вы, верагодна, шмат «інвестуеце» ў яе — часу і сілаў. І адчуваеце віну за тое, што не зрабілі больш. Але як толькі вы зразумееце, што будучыня вашых дзяцей шмат у чым залежыць ад прыроды і ад іх саміх, вы можаце адпачыць ад пачуцця віны.

Калі вы любіце чытаць сваім дзецям перад сном — выдатна. Але і калі не чытаеце, гэта ніяк не адаб'ецца на развіцці іх інтэлекту.

Трохі расслабцеся ў сваім стаўленні да дзяцей. Гэта найлепшы падыход. Прыгнятаць уласных дзяцей «дзеля іх жа саміх» не дасць чаканага эфекту і можа кепска паўплываць на стаўленне дзяцей да вас.

Найбольшы плён педагогікі — гэта ўдзячнасць дзяцей. Калі вы ахінеце сваіх дзяцей любоўю і гармоніяй, яны абавязкова запомняць гэта на ўсё жыццё.

**КаМ; паводле «Уол-стрыт джорнал»**

# Топ-10 фразаў, якія раздражняюць

### «Пабачым»

Абсалютны лідэр рэйтынгу. Гэтае слова жанчына чуе, калі мужчыну не падабаецца перспектыва паходу ў тэатр або запрашэнне ў госці да бацькоў. Адмова раўназначная распальванню міжнароднага скандалу. Даводзіцца абмежавацца сціплым «пабачым».

### Не ведаю

Другая па папулярнасці фраза пры жаданні ўнікнуць простага адказу — «Не ведаю».

«Што ты хочаш на вячэру?» — «Не ведаю»; «Дзіця ела?» — «Не ведаю»; «Дзе твой пашпарт?» — «Не ведаю»...

### «А мая былая дзяўчына...»

Найлепшы сродак для разбурэння шлюбу. Зрэшты, каб адвучыць мужчыну ад такіх згадак, можна спытаць яго: «І дзе твая былая дзяўчына цяпер?»

### «А мама гатуе гэта іначай»

Фраза-пароль, якая імгненна можа прывесці жанчыну ў шал. «Ізноў недасаліла»; «Я такое еў учора, сёння не буду...» Жанчына, якая стаяла некалькі гадзін ля пліты пасля цяжкага працоўнага дня, у найлепшым выпадку скажа ўсё, што думае пра хатняе рабства і свякроў, у найгоршым — пацягнецца па чыгунную патэльню.

### «Зараз...»

Мужчыны злоўжываюць гэтай фразай, не разумеючы, што іх «зараз» цягнецца бясконца доўга. Паспявае астыць вячэра, скончыцца любімы фільм і самае галоўнае — сапсавацца настрой. Таксама жанчын раздражняе, калі мужчыны спасылаюцца на занятасць на працы (у пятніцу вечарам), заторы, важную размову з калегам і дрэнны настрой.

### «Ты мне гэтага не казала»

А часам мужчыны і ўвогуле забываюць пра дадзенае раней абяцанне.

### «ОК»

Мова інтэрнэта — усюдыісная, але недарэчная, калі справа датычыць адносін. Ніштo так не раздражняе жанчыну, як адказ з дзвюх літар на доўгае паведамленне. Шматзначнае «м-та-а-к» раздражняе не менш: «Падабаецца — не падабаецца, горача — халодна...» Паспрабуй разбярыся...

### Цішыня

Маўчанне для мужчын — знак згоды, для жанчын — у першую чаргу абыякавасць:

— Сонейка, што ты будзеш на вячэру?

— (Цішыня.)

— Хочаш, я зраблю рыбу і салату?

— (Цішыня.)

— Скажы хоць што-небудзь, а то я зараз стукну цябе прасам!

— А? Што? Ты нешта казала?

### «Вазьмі ды зрабі»

Жанчыны проста не ўмеюць прасіць. Замест таго каб сказаць «Зрабі, калі ласка», яны пытаюцца: «Не мог бы ты вынесці смецце?» Для мужчыны гэта проста пытанне, а не просьба. Вядома, ён можа гэта зрабіць! Успрымаючы пытанне як абразу, ён можа адмовіцца выканаць просьбу.

### «Нармальна!»

«Ну, як абед? — «Нармальна»; «Табе падабаецца мая новая кофтачка?» — «Нармальна...» Мужчына, сам таго не жадаючы, наносіць непапраўную шкоду жаночаму самалюбству. Невыпадкова для таго, каб паміж мужам і жонкай захоўвалася цікавасць адно да аднаго, псіхолагі настойліва рэкамендуюць мужчынам навучыцца рабіць кампліменты. Тым самым яны не толькі робяць жанчынам прыемнае, але і спрашчаюць сабе жыццё. У сваю чаргу, жанчынам трэба вучыцца прымаць кампліменты, не апраўдваючыся і не адказваючы на іх аднаслоўна.

### «Дзе мае шкарпэткі?»

Як жа часта жанчынам даводзіцца чуць фразу пра шкарпэткі (пантофлі, гальштук і г.д.)! Псіхолагі раяць не раздражняцца, але і не бегчы да мужа на дапамогу з першага яго покліччу. Няхай хоць раз сам разбярэцца, дзе яго адзенне. Калі вы не будзеце пастаянна ўмешвацца ва ўсе пачынанні мужчыны, ён будзе больш самастойным.

**КаМ**

КАХАННЕ І СЭКС

# Фліртаваць з мужчынам няма сэнсу

**Што б вы ні намякалі, мужчына ўсё адно няправільна зразумее.**

Жанчыны, колькі разоў было такое: ёсць мужчына, які прыпаў вам да сэрца, але як яго завабіць? Амерыканскія навукоўцы з універсітэта штата Індыяна сцвярджаюць: што б вы ні намякалі, мужчына ўсё адно няслушна зразумее вашы намёкі.

Жанчыны фліртуюць не менш за мужчын. Робяць новыя прычоскі, кідаюць красамоўныя позіркі, панадна ўсміхаюцца. Але ўвага: вельмі часта мужчыны няправільна расшыфроўваюць гэтыя, здавалася б жанчыне, недвухсэнсоўныя намёкі.

Даследчыкі з універсітэта штата Індыяна даводзяць, што большасць мужчын «сляпыя» адносна флірту і залётаў. Жанчыны, у адрозненне ад мужчын, не «накідваюцца» на аб'ект свайго жадання, а дасылаюць яму знакі. А мужчына папросту не разумее іх.

У індыянскім эксперыменце бралі ўдзел каля 300 чалавек. Студэнтаў і студэнтак папрасілі размеркаваць па катэгорыях і апісаць паводзіны жанчын, калі яны: выказваюць сяброўскую прыязнь, сумуюць, выказаюць зацікаўленасць у мужчыну або калі адпрэчваюць непрыемнага мужчыну. Студэнты і студэнткі праглядалі фотакарткі жанчын і размеркавалі іх па тых чатырох катэгорыях. Высновы: студэнты-хлопцы памыляліся значна часцей. Асабліва часта мужчыны блыталі праявы флірту.



Толькі адсотак мужчын таленавіта «чытае» жаночыя знакі.

Навукоўцы дадаюць, што гэты эксперымент — яшчэ адзін доказ больш складанай пабудовы жаночых паводзінаў у пытаннях пачуццяў.

**КаМ**

ТЭХНАЛОГІІ

# ЗША выпрабоўваюць мікрахвалевую зброю

**Элемент Active Denial System — Pain Ray, ці 100-кілаватны ЗВЧ-выпраменьвальнік, выправіўся ў Афганістан.**

Прылада забяспечвае некамфортнае пачуццё «гарэння жыўцом».

Як гэта працуе? Груба спрашчаючы — як звычайныя мікрахвалёвыя печкі. Pain Ray пасылае хвалі, якія «падымаюць» малекулы вады ў верхнія слаі скуры чалавека. Гэта змушае рухацца і суседнія малекулы, і тэмпература абпрамененай паверхні павялічваецца. У выпадку абпраменьвання чалавека праз вельмі кароткі час з'яўляецца невыноснае пачуццё, быццам уся скура гарыць.

Гэта выдатнае «мірнае» вырашэнне праблемы «кіравання» варожым натоўпам, без адкрывання агню і лятальнага выніку. Pain Ray функцыянуе яшчэ не цалкам. Цяпер працягваюцца выпрабаванні, накіраваныя на знішчэнне недахопаў.

Памеры Pain Ray патрабуюць для яго транспартавання выкарыстання вялікіх грузавых аўтамабіляў. Запуск прыстасавання займае шмат гадзін, што выключае магчымасць яго самавольнага выкарыстання. У ідэале плануецца пабудаваць некалькі прыладаў, што будуць усталёўвацца на бронетранспарцёрах і папулярных «Хамерах».

Келі Х'юз, прэс-сакратар праграмы Joint Non-Lethal Weapons — аднаго з заснавальнікаў праекта, — кажа, што выпраменьвальнік ужо дастаўлены ў Афганістан, але, хутчэй за ўсё, не будзе выкарыстоўвацца.

**КаМ паводле «Газеты выборчай»**



# Грузінскі балет у Мінску



**5 ліпеня на сцэне Мінскай оперы** мы зможам пабачыць знакаміты грузінскі балет. У Мінску грузіны прэзентуюць тры аднаактавыя балеты: «Серэнаду» Чайкоўскага, «Шэсць танцаў» Моцарта і «Сагалабелі» паводле грузінскай народнай музыкі.

Тбіліская Опера — адна з найстарэйшых у свеце. Яна была заснаваная ў 1853 г., і яе прыгадваў ва ўспамінах нават Аляксандр Дзюма-старэйшы. Тэатр паўстаў, дзякуючы культурніцкім і незалежніцкім памкненням грузінаў у складзе Расійскай імперыі. Першыя гады дзейнасці тэатра актораў запрашалі з Італіі, потым прыйшлі грузінскія і расійскія выканаўцы. Сёння мастацкім кіраўніком балета Тбіліскага тэатра з'яўляецца зорка сусветнага балета і былая салістка Вялікага тэатра Ніна Ананіяшвілі.

## ФЕСТЫВАЛІ

### Тыдзень касцельнай музыкі

Секцыя касцельнай музыкі пры Канферэнцыі каталіцкіх біскупаў Беларусі ў супрацы з Акадэміяй музыкі **ад 5 да 9 ліпеня** праводзіць IX Тыдзень касцельнай музыкі. Урачыстае адкрыццё адбудзецца **5 ліпеня ў Катэдры (пл. Свабоды, 9) у 12.00**. У якасці кіраўніка творчых майстэрняў запрошаны вядомы музыкант з Універсітэта музыкі і мастацтваў Граца (Аўстрыя), доктар Валянціна Лонга. Тыдзень касцельнай музыкі будзе ўключаць: **6 ліпеня** — канцэрт кіраўнікоў творчых майстэрняў; **5–9 лінeня** — майстар-класы па адзначаных кірунках; **9 ліпеня** — заключны канцэрт IX Тыдня касцельнай музыкі (усе мерапрыемствы — **у Катэдры (пл. Свабоды, 9)**).

### Басовішча

**16—18 ліпеня ў лясах Беласточчыны** пройдзе фестываль музыкі маладой Беларусі «Басовішча-2010». Будуць **«Тройца»**, **«Гурзуф»** і **«Адыс Абеба»,** упершыню плануюць прыняць удзел **«Ляпіс Трубяцкой»**.

### Грунвальд

**15—18 ліпеня ў Польшчы** пройдуць святкаванні, прысвечаныя 600-годдзю Грунвальдскай бітвы. **Ля Дуброўна (Грунвальда, Жальгірыса)** адзначаць юбілей перамогі беларуска-літоўска-польскага войска над Тэўтонскім ордэнам. Тэатралізаваныя шоу з удзелам Ягайлы і магістра фон Юнгінена з коннымі харугвамі, рыцарскім турнірам, фаер-шоу, канцэртамі сярэднявечнай і народнай музыкі і збудаваны горад рамеснікаў. І, вядома, **17 ліпеня ў 14.00** — грандыёзная інсцэнізацыя векапомнай сечы, якая, дарэчы, не абыдзецца без беларускіх харугваў пад «Пагоняй». Разам чакаюць прыбыццё каля 5 тысяч рыцараў (нагадаем, у сапраўднай бітве ўдзельнічала ўсяго толькі ў 12 разоў больш).

## КАНЦЭРТЫ

### Gods Tower

**4 ліпеня ў клубе «Рэактар» (вул.Харужай, 29)** адбудзецца канцэрт метал-легенды, гурта **Gods Tower** з Гомеля. Удзел бярэ гурт **«Зніч»**. **Пачатак а 18-й.**

### Разбітае сэрца пацана

**4 ліпеня ў клубе «Графіці»(зав.Калініна, 16)** — «Разбітае сэрца пацана». Гурт спявае на трасянцы і мае дадатковы шоу-кардэбалет з дзвюх дзеўчын. **Пачатак а 18-й.**

### Трыа «Вытокі» — да 200-годдзя Шапэна

Трыа «Вытокі» — Сяргей Махаў (флейта), Аляксей Фралоў (фагот), Ірына Аўдзеева (фартэпіяна) — прэзентуюць праграму да юбілею Шапэна. Канцэрт пройдзе **ў Мінску 30 чэрвеня ў 18.00 у Дзяржаўным музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры (Музычны завулак, 5)**. Квіткі на канцэрт — у касе музея. Прагучыць музыка Шапэна, Ельскага, Орды, Тарасевіча.

## ВЫСТАВЫ

### Прэзентацыя кнігі Караткевіча з малюнкамі Купавы

**У Музеі гісторыі беларускай літаратуры (вул.Багдановіча, 13) 30 чэрвеня** — прэзентацыя выдання казак Уладзіміра Караткевіча «Лебядзіны скіт». **Пачатак а 17-й.** Кніга ўнікальная не толькі зместам, але і выдатным мастацкім аздабленнем. Пяцьдзясят чатыры малюнкі да яе зрабіў мастак Мікола Купава. Тамсама будзе працаваць і выстава ілюстрацыі да кнігі.

### Старажытны Віцебск на карцінах

**У Палацы мастацтва (вул.Казлова, 3) да 4 ліпеня** працуе выстава Міхаіла Ляўковіча, прымеркаваная да 60-годдзя мастака. Міхась Ляўковіч — прадстаўнік Віцебскай мастацкай школы. Старажытны Віцебск увайшоў у ягоныя карціны. Гэта і прынесла вядомасць мастаку ў пачатку 1980-х.

### Жалеза скончылася

**У галерэі сучаснага мастацтва «Ў» (пр.Незалежнасці, 37а) да 5 ліпеня** працуе выстава Андрэя Капуснікава «Жалеза скончылася». Андрэй Капуснікаў — майстар, вядомы як мастак па ржавым метале, сабраў свае працы з нікім не чаканага (ад яго) дрэва.

## ТЭАТРЫ

**1 ліпеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Тры парсючкі»
**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Яго апошняе каханне (Лета)»
**Тэатр оперы і балета** — «Князь Ігар»

**2 ліпеня**

**Тэатр оперы і балета** — «Лебядзінае возера»
**Тэатр імя Горкага** — «Пане Каханку»

**4 ліпеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Ніначка»
**Тэатр оперы і балета** — «Кармэн»

**5 ліпеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
**Тэатр оперы і балета** — грузінскі балет: «Серанада», «Сагалабелі», «Шэсць танцаў»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Містэр Розыгрыш»

**6 ліпеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Тэатр оперы і балета** — Гала-канцэрт у Вялікім
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Раман + Юлія»
**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»

**7 ліпеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Па зялёных гурбах акіяна»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чайка»
**Тэатр оперы і балета** — «Папялушка»
**Тэатр імя Горкага** — «Злоўлены сеткай»

**8 ліпеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Дарога на Віфлеем»
**Тэатр імя Горкага** — «Бег»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»

**9 ліпеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Вандраванне ў княства Сноў»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адэль»
**Тэатр імя Горкага** — «Жаніхі»

**10 ліпеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце лепш»

**11 ліпеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Рускія вадэвілі»

## КІНО

### «Ноч пажыральнікаў рэкламы» — штотыдзень

Падборкі маленькіх рэкламных шэдэўраў можна будзе глядзець кожны тыдзень. «Ноч пажыральнікаў рэкламы» атрымае прапіску **ў новым арт-кінатэатры Rubin Plaza**, які адкрыецца гэтым летам **на праспекце Дзяржынскага, 5**.

## КІНО

# Джульета ў мармеладзе

**Лісты да Джульеты** (Letters to Juliet)
ЗША, 2010, каляровы, 105 хв.
**Рэжысёр:** Гары Уінік
**Жанр:** меладрама, рамантычная камедыя
**Адзнака:** 4 (з 10)




Заручаная з Віктарам Сафія едзе ў Верону, горад Джульеты. Занудзіўшыся на дзелавых сустрэчах свайго жаніха, Сафія знаёміцца з «сакратаркамі Джульеты», якія адказваюць на любоўныя лісты з усяго свету. На адзін такі згублены ліст, датаваны 1951 годам, адказала і гераіня. Нечакана аўтарка ліста вяртаецца ў Верону, каб знайсці сваё першае каханне. Разам з ёю прыгожы ўнук…

«Лісты да Джульеты» — самы пяшчотны дамскі кіч, які толькі можна сабе ўявіць. Тут ёсць усё неабходнае. Сонечная італьянская прырода і рамантычная музыка, гутаркі пра любоў і лісты пра любоў, уздыхі ад расповедаў пра каханне і лёгкія слёзы.

Ёсць пекны Гаэль Гарсія Берналь, які сцішыў свой тэмперамент для дамскага рамана, і ёсць Крыстафер Іган, саладжавая копія Гіта Леджэра. Ёсць арыстакратычная Ванеса Рэдгрэйв — з вачыма занадта разумнымі для просценькай меладрамы.

Чаго няма ў гэтай мармеладнай стужцы, дзе лепшае змагаецца з найлепшым, а цукернае — з найцукернейшым, дык гэта канфліктаў.

Але яны і непатрэбныя рамантычным марам. Карціна для 15-гадовых летуценніц, якія толькі абдумваюць жыццё.

**Андрэй Расінскі**

# Будслаўскі фэст

I і 2 ліпеня ў Будславе, на Мядзельшчыне, адбываецца фэст у гонар Маці Божай Будслаўскай, Апякункі Беларусі.

Традыцыя пілігрымак у Будслаў аднавілася за незалежнасцю, на пачатку 1990-х. Ад таго часу тысячы вернікаў з Беларусі і ўсяго свету,каталікоў і праваслаўных, прыходзяць да касцёла пакланіцца абразу Нябеснай Апякункі Беларусі. Фэст у Будславе зрабіўся самым велічным, урачыстым і, зрэшты, самым беларускім святам краіны.

Кульмінацыяй фэсту з'яўляецца ўрачыстае шэсце з цудатворнай іконай. Дзясяткі тысяч людзей з запаленымі свечкамі абыходзяць цэнтральную плошчу мястэчка і вяртаюцца да касцёла. Нібы жывая вогненная рака плыве перад велічнай базілікай. Гэта прыгожы і велічны момант, які абавязкова трэба пабачыць на свае вочы, каб адчуць гісторыю і ўрачыстаць свята Маці Божай Будслаўскай.

**НШ**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

### 1 ліпеня, чацвер

**13.00—17.00** — сустрэча і прывітанне пілігрымаў.
**18.00** — святая Імша для пілігрымаў.
**20.30** — Акафіст (хор грэка-каталіцкай Царквы).
**21.00** — марыйныя Нешпары (ксяндзы-салезіяне).
**23.00** — святы Ружанец (айцы-кармеліты).
**24.00** — працэсія і святая Імша (цэлебруе арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч; спеў — мінская парафія Найсвяцейшай Тройцы (Св. Роха) на Залатой Горцы).

### 2 ліпеня, пятніца

**02.00** — моладзевая праграма ў палатачным гарадку (гурт «Небасхіл»; Алеся Унукоўская).
**02.00** — святая Імша паводле грэка-каталіцкага абраду (перад абразом Маці Божай).
**04.00** — адарацыя Найсвяцейшага Сакрамэнту (у базыліцы).
**05.30** — Гадзінкі аб Беззаганным Зачацці Найсвяцейшай Панны Марыі на польскай мове (спеў — пілігрымы).
**06.00** — святая Імша перад абразом Маці Божай (цэлебруюць айцы-бернардыны).
**07.30** — святы Ружанец (ксяндзы-марыяне).
**08.30** — святая Імша на польскай мове ў базыліцы (цэлебруюць арцыбіскуп Варшаўска-Пражскі Хенрык Хосэр і айцы-новапрэсвітэры).
**10.00** — прэзентацыя Кампендыя ККК на беларускай мове (арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч) і прадукцыі выдавецтва «Про Хрысто».
**10.30** — святая Імша (цэлебруюць біскупы Беларусі; спеў — хор мінскай архікатэдры «Gloria»).
Выстаўленне Найсвяцейшага Сакрамэнту, працэсія.
Гімн Te Deum laudamus.
**13.00** — святая Імша на польскай мове (біскуп Антоні Дзям'янка).

# Беларускія вёскі Крыма

**Мала хто едзе ў Крым у пошуках землякоў. І дарма. Беларусаў там шмат, і многія ахвотныя прымаць гасцей з Бацькаўшчыны.**

Нашы продкі жылі ў Крыме спрадвеку. Нехта трапляў у татарскі палон, іншыя прыходзілі самі як ваяры, святары, пілігрымы ці гандляры.

Дый тры разы ў Крым хадзілі,
З Крыму солі прывазілі!
Ой вы, волы мае ды волы,
З Крыму едучь, дый рыкаюць.

Пачаткі сталага пасялення беларусаў у Крыме сягаюць XVIII ст. Тады і Беларусь, і Крым апынуліся ў Расійскай імперыі. Так, у 1788 г. гвалтам былі перавезеныя прыгонныя сяляне з Магілёўскага намесніцтва ў спусцелую вёску Азамат (цяпер Васільеўка Белагорскага раёна). Паводле перапісу 1897 г. «беларусаў» налічвалася 2058 чалавек. Найбольш нашых землякоў тут апынулася ў канцы 1950-х, пасля этнічнай чысткі Крыма савецкімі ўладамі.

Апошні значны эмігрант — дэпутат-палітвязень Уладзімір Кудзінаў. Пасля вызвалення ён пераехаў у Крым і стварыў там паспяховы аграбізнэс.

### Дзе шукаць

Вялікія супольнасці беларусаў жывуць у вёсцы Шырокае пад Сімферопалем, у вёсках між стэпаў паўночнага Крыма — Мар'янаўка, Ішунь, Воінка, адкуль да мора далёка. Тамтэйшыя беларусы кажуць з горкай усмешкаю, што яны ў Крыме жывуць, але за працаю мора не бачаць... Хоць багата беларусаў жыве і ў Ялце, Севастопалі, Феадосіі. Мяркуючы па дагледжанасці магілы Багдановіча ў Ялце, яны там не самотныя.

У сяле Шырокім ёсць цэлы беларускі музей з трох пакояў, у якім сабраныя выдатныя этнаграфічныя экспанаты. Тут можна ўбачыць палескія ручнікі яшчэ царскіх часоў, глякі, збаны, вышыванкі. Нават цэлую беларускую хаціну. Музей быў створаны рупнасцю Віктара Гулевіча, работніка тамтэйшага Дома культуры. Спадар Гулевіч, як і многія беларусы Шырокага, перабраўся сюды з сям'ёй пасля Чарнобыля. Але свайго не схаваеш, шчыміць сэрца па радзімай старонцы. Гэта Віктар Гулевіч напісаў гімн беларусаў Крыма:

У якой бы старонцы ні быць нам — з табой
Наша сэрца, ты знай.
У Крыме назвалі нас дочкай і сынам.
Ад нас табе песня, прымай!

### Варыянт для аўтападарожнікаў

Варта выйсці з машыны і запытацца ў Ішуні ці ў Шырокім, дзе тут беларусы, — вам пакажуць адразу. У засені плодных шчодрых садоў, у цяністых вінаградніках беларускія хаты тут адны з найлепшых. Гасцям радыя заўжды. Гаспадары пакажуць ураджайныя гароды, пахваляцца неабмежаванай калекцыяй хатніх закрутак-залівак і... з тугою згадаюць цупкую, развэрыстую беларускую бульбу.

Для тых, хто выбіраецца ў Крым машынай, гасцінная сустрэча землякоў — цікавы варыянт. З любога пункту Крыма можна аўтамабілем дабірацца да мора. Але ваколіцы «беларускіх» Васільеўкі ці Мар'янаўкі цікавыя і без пляжаў. Каго цікавяць горы, вадаспады ці даліны ў пярэстых мазаіках красак — то вы там такое знойдзеце. А таксама экалагічна чыстыя мёд, садавіну, добрае віно.

Натуральна, варта прыхапіць з сабою беларускіх гасцінцаў. Толькі не бярыце цукерак! Ва Украіне іх — на любы густ, а вось давезці да Крыма ў належным стане шакалад — праблематычна.

Для беларусаў, якія жывуць у сельскіх раёнах паўвострава, знайсці добры заробак цяжка. Таму яны з радасцю гатовыя прымаць турыстаў. Пагатоў, землякоў-радакоў!

**Сяргей Харэўскі**



Краявіды беларускай вёскі Васільеўка.



У этнаграфічным музеі беларускай вёскі Шырокае.






Магіла Максіма ў Ялце.

**Славутыя землякі ў Крыме**

На мысе Ая, у ваколіцах паселішча Новы Свет, растуць дзіўныя сосны. Іх адкрыў для навукі наш зямляк, лесавод і натураліст Уладзімір Станкевіч. І да сёння гэты рэліктавы від сасны завецца сасной Станкевіча.

Пра беларускі Крым можна скласці энцыклапедыю, пачаўшы ад Еўфрасінні Полацкай. Першую фундаментальную гісторыю Крыма напісаў магілёўскі арцыбіскуп Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч, які падарожнічаў з Пацёмкіным у Крым вясною 1783 г. Сестранцэвіч напісаў паэтычную трагедыю «Гіцыя ў Таўрыдзе» і фундаментальную двухтомную «Гісторыю Таўрыды» па-французску.

А самую змястоўную кнігу пра Крым напісаў прафесар Таўрычаскага ўніверсітэта Андрэй Няпомняшчы, родам з Бабруйска.

Беларус Міхал Юрахно ўславіўся як выбітны заолаг, натураліст, стваральнік шыкоўнага Заалагічнага музея пры ўніверсітэце. Раю наведаць. Як і Крымскі этнаграфічны музей у Сімферопалі, што некалі быў заснаваны Арсенем Маркевічам з Брэста і дзе зберагаецца нямала беларускіх экспанатаў. Дарэчы, тут я дазнаўся, што падчас дэпартацыі народаў Крыма, у 1944-м, як радню прадстаўнікоў «ворагаў» народа выслалі і 12 беларусаў. Нявывучаным застаецца і лёс інсургентаў 1863 года, што воляю лёсу засталіся ў тых краях.

**Магіла Багдановіча**

Паэт, які памёр маладым, пахаваны на Старых гарадскіх могілках. На магіле паэта ўсталяваны помнік аўтарства бацькі і сына Льва і Сяргея Гумілеўскіх. Адразу пры ўваходзе на могілкі стаіць указальнік «Максім Багдановіч».

ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА

## Штрафы за парушэнне правіл збірання грыбоў

Заканадаўства дазваляе два спосабы збірання грыбоў — зразаць іх нажом ці акуратна выкручваць з коранем. Таксама няможна збіраць малыя грыбкі. Напрыклад, забаронена збіраць лісічкі з памерам шляпкі меншым за 1,5 см у дыяметры. Таксама забаронена разграбаць лясную посцілку, шукаючы грыбы.

Штраф за парушэнне — да 20 базавых велічынь (700 тыс. рублёў).

**СМ**

НЯБЕСНЫЯ БЕГІ

## Вады на Месяцы ў 100 разоў болей, чым лічылася

Праўда, каб яе здабыць, давялося б выціскаць камяні, як рабілі героі беларускай казкі пра цмока. Канцэнтрацыя вады ў мінералах, якія ўтвараюць месяцовы грунт, значна большая, чым лічылася раней, — ад 65 мільярдных доляў да 5 мільённых па вазе, паведамляюць навукоўцы ў дасledаванні, апублікаваным у часопісе Proceedings of The National Academy of Sciences. Паводле абсалютнага значэння, гэта колькасць вады на Месяцы адпавядае колькасці вады ў Вялікіх азёрах Паўночнай Амерыкі. Вады на Месяцы ў 100 разоў больш, чым лічылася.

Але куды Месяцу да Марса. Навукоўцы, чый артыкул апублікаваны ў часопісе Nature Geoscience, даказалі, што прыкладна 3 мільярды гадоў таму трацціну паверхні Чырвонай планеты займаў акіян. У яго ўпадалі рэкі, а ў атмасферы фармаваліся воблакі і ішлі дажджы. Плошча таго акіяна складала 36% ад паверхні планеты. А ўвесь аб'ём вады — 124 мільёны кубічных кіламетраў. Гэта ў 10 разоў менш, чым аб'ём усіх акіянаў Зямлі, прытым што Марс па памерах складае крыху больш за палову нашай планеты.

**СМ**

КОЛЫ

## За перавышэнне хуткасці адказа не кіроўца, а ўласнік аўто

Палата прадстаўнікоў прыняла ў першым чытанні змены ў Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях. Цяпер, калі відэакамера ДАІ зафіксуе перавышэнне дазволенай хуткасці руху, да адказнасці будзе прыцягвацца ўласнік машыны. Калі ж ён не кіраваў аўтамабілем у момант фіксацыі правапарушэння, яму самому прыйдзецца даказваць невінаватасць.

**ЯВ**

## Сапраўдная беларуская кухня

### Гарошак па-французску

1,5 л свежага гарошку, 1 лыжка масла, 1—2 лыжачкі цукру, 1 галоўка салаты, 0,5—1 шклянка булёну, соль, зялёная пятрушка.

Да гарошку дадаць масла, соль, нарэзаныя пятрушку і салату. Варыць на малым агні, памешваючы. Масла растопіцца, а салата выпусціць досыць вады. Аднак калі вадкасці мала, то трэба дадаць трохі булёну. Пасаладзіць гарошак і варыць да мяккасці, а перад падачай пакласці ў страву яшчэ троху масла, перамяшаць, падагрэць, але ўжо не кіпяціць.

**З кнігі В. Завадскай «Літоўская кухарка», 1854 г.**
**Падрыхтавала НБ**

## Прыватныя абвесткі

**ВІТАННІ**

**Мілая, дарагая мама Анэля Кулаковіч!** Віншуем Вас, мама, з 80-годдзем. Няхай твой анёл захоўвае табе здароўе і радасць, няхай цябе не пакідае. А мы будзем заўсёды пры табе. Ірына і Валодзя.

**СПАЧУВАННІ**

**18 чэрвеня на 74-м годзе жыцця** памёр сп. Сяргей Андрэевіч Язерскі, выдатны доктар-псіхатэрапеўт, сябар БНФ «Адраджэнне», сябар Таварыства беларускай мовы, выкладчык Беларускага гуманітарнага ліцэя, стваральнік клуба «Спаемства», сапраўдны грамадзянін краіны, добры, шчыры і зычлівы чалавек. Гэта вялікая страта для нас, сяброў, ягоных блізкіх, для ўсёй беларускай грамады краіны.

**ВАНДРОЎКІ**

**Антон Астаповіч запрашае** ў сяброўскае падарожжа 18 ліпеня па маршруце: Мінск—Аўгустоўскі канал—Сапоцкін—Свяцк—Навумавічы—Адэльск—Квасоўка—Індура—Мінск. Т.: (017) 262-73-43, (029) 111-73-32.

**Запрашаем у падарожжа** ад 12 да 21 ліпеня 2010 г. па маршруце Чанстахова—Вена—Рым— Ватыкан—Фларэнцыя—Браціслава. Т.: (029) 618-72-99; 518-72-27.

**КНІГІ, ДЫСКІ**

**Прадам дыскі** В.Шалкевіча, 3 нумары альманаха «Тэксты». Т. (029) 332-69-56. Святлана.

**Набуду кнігі** Васіля Супруна. Т. (0296) 383-00-06.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Кемікі



1) Чым канчаецца сакавік, а пачынацца красавік?

2) Да якога месца воўк у лес бяжыць?

3) Які год працягваецца ўсяго толькі адзін дзень?

4) З якой талеркі не паснедаеш?

**Сабрала Валянціна Карнялюк**

**Адказы глядзі на старонцы 16.**




**Паводкі на Нямізе робяцца рэгулярнасцю.**
**Праз недастатковасць наяўнага ліўневага калектара даліна колішняй рэчкі робіцца паўнаводным патокам пры кожнай вялікай залеве. У суботу 26 чэрвеня ў водным палоне аказаліся дзясяткі пасажыраў і кіроўцаў. МНСаўцы правялі імклівую аперацыю па эвакуацыі людзей.**




**З галоўнай плошчы ў Горы скінулі помнік Сталіну. На яго месцы паўстане манумент нацыянальным героям. Сталіна ж переставяць на тэрыторыю яго Дома-музея.**




**У Кіеве ўдзельніцы жаночага руху FEMEN зладзілі акцыю пратэсту пад назвай «Сучкі» ля будынка Службы бяспекі Украіны. Нагодай сталі выклікі актывістак руху ў СБУ на «прафілактычныя» гутаркі. У часе акцыі дзяўчаты скандавалі: «Сукі, прыбярыце рукі!», «Свабоду пратэсту!».**

## ЖАРТ





РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ
РЕСПУБЛИКА БЕЛАРУСЬ
REPUBLIC OF BELARUS
ВАДЗІЦЕЛЬСКАЕ ПАСВЕДЧАННЕ
ВОДИТЕЛЬСКОЕ УДОСТОВЕРЕНИЕ
DRIVING LICENCE
1. ИВАНОВА
IVANOVA
2. ОЛЬГА АЛЕКСАНДРОВНА
OLGA
3. 01/01/1970 Могилевская обл.
Mogilevskaja obl.
4a. 21/03/2009 4b. 21/03/2009
4c. ГАИ Могилевской обл.
GAI Mogilevskoy obl.
5. AA 00000000
9. A1 A B C D BE CE DE I F AM

**Узор новага вадзіцельскага пасведчання практычна гатовы. Пасведчанні новага ўзору пачнуць выдаваць у лістападзе—снежні 2010 года. Першымі іх атрымаюць тыя, хто паспяхова завершыць навучанне ў аўташколах, і кіроўцы-дальнабойшчыкі.**

# «Будзе карысны падчас экзаменаў, залікаў ды іншых катаванняў»

У разгар уступнай кампаніі і летняй сесіі каля ўніверсітэтаў множацца аб'явы пра мікраслухаўкі.

На вуліцы Румянцава, акурат насупраць галоўнага корпуса Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, усе сцены залепленыя абвесткамі, адрасаванымі абітурыентам і школьнікам. Ім прапануецца ўзяць у арэнду або набыць мікранавушнік. Ён, згодна з рэкламай, будзе вельмі «карысны падчас уступных ды дзяржаўных экзаменаў, залікаў ды іншых катаванняў».

Аўтары абвесткі даюць свае нумары і ICQ.

Сённяшнія ды ўчорашнія студэнты кажуць, што пік папулярнасці такіх прыстасаванняў назіраўся гады чатыры таму. Напрыклад, у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы мікранавушнік здавалі ў арэнду за 30 еўра за гадзіну карыстання. Цяпер такая паслуга каштуе ў разы танней. Па тэлефонах, пазначаных на абвестках каля МДЛУ, паведамілі, што арэнда прыстасавання на суткі каштуе 30 тысяч беларускіх рублёў (прыблізна 8 еўра). Набыць камплект можна за 100 даляраў.

Нагадаем, што выкарыстанне такіх прыстасаванняў на любых экзаменах ва ўсіх навучальных установах забароненая.

**Сямён Печанко**

## Анекдоты

* * *

Футбаліст у раі.
— Госпадзе, мне тут зусім няма чым заняцца. Пабудуй стадыён, я буду трэніравацца.
Госпад пабудаваў.
Праз месяц.
— Госпадзе, у нас ужо каманда арганізавалася. Давай з пеклам у футбол згуляем.
Бог тэлефануе д'яблу:
— Слухай, д'ябал, у цябе футбалісты ёсць? Хай яны з нашымі згуляюць.
— Не, не выйдзе. У мяне тут адны суддзі...

* * *

Амерыканскія вучоныя нарэшце вынайшлі аўтамабіль, які працуе на вадзе. На жаль, пакуль ён працуе толькі на вадзе з Мексіканскага заліва...

* * *

Свой мозг чалавек выкарыстоўвае толькі на 3%. Пры гэтым грузіць мозг іншаму чалавеку на ўсе 100%...

* * *

Як сцвярджае Казіміравіч, вартаўнік гастранома № 15, Дэвід Коперфільд можа не толькі прайсці праз сцены, але і пранесці праз іх 40 скрыняў гарэлкі.

* * *

Багатыя людзі не падобныя да нас з вамі: у іх нашмат большыя пазыкі.

* * *

Прэзідэнт Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедаў наведаў вулкан Эяфлад'яёкюдль. Абодва здзівіліся.

## «НН» сто гадоў з вамі

**Мінск.** Жыды, як ведама, не маюць правоў на некаторыя службы. Законаў новых яшчэ Дзярж. Дума не зрабіла. У сіроцкі суд (ён апекуецца сіротамі-мяшчанамі) трэба выбраць новага члена. Усе купцы жыды, а трэба, каб член быў хрысціянін.

**«НН». № 23—24. 1910.**

**Моўная праблема**

Студэнта V курса геаграфічнага факультэта БДУ, лідэра Маладога Фронта Паўла Севярынца, які сёлета мусіў скончыць навучанне на спецыяльнасці «геалогія», 15 чэрвеня не дапусцілі да абароны дыпломнай працы «Бурштын Беларусі». Дэкан факультэта, Іван Піражнік, не дазволіў абараняць дыплом, напісаны беларускай моваю ў класічным (тарашкевіцкім) правапісе. Цяпер Паўлу Севярынцу, які мае амаль усе выдатныя экзаменацыйныя адзнакі за 5 гадоў навучання, пагражае адлічэнне з універсітэта.

**«НН». № 25.2000.**

**Адказы на кемікі са старонкі 15.**
1) Літарай «к». 2) Да сярэдзіны лесу. 3) Новы год. 4) З парожнім.

**Наша Ніва**
незалежная газета
заснаваная ў 1906, аднoўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).
сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6340.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 29.06.2010.
Замова № 3114.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614